Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародніх	— 20 к.
часцовых	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нанпарэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок нанпарэлі пасярод тэксту	1 р. — к.
За радок нанпарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпешныя на 50 проц. даражэй.

Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 116 (2304) Аўторак, 22-га мая 1928 г.

Бэнэш—Залескі—Вольдэмарас.

Бэнэш—чэхаславацкі міністр замежных спраў—накіроўваецца ва ўласьцівае яго «стылю» шумнае вясеньняе падарожжа па Эўропе. Ён быў у Лёндане, мінуючы Парыж і Рым, і накіроўваецца зараз у Бэрлін.

Чаго ён шукаў? Чаго дамагаецца?

Гэтыя пытаньні заслугоўваюць увагі, зразумела, не з суб'ектыўнага пункту гледжаньня. Бэнэш палітычны дзеяч занадта руплівы, яго рухі вельмі часта маюць выгляд глыбокага правінцыялізму, і мабыць меў падставу Пашыч—«балканскі Бісмарк», — назваўшы калісьці свайго калегу па Малай Антанце пачынаючым камбіняжэрам. Але на фоне эўрапэйскай сапраўднасьці нашых дзён, сярод бязупынных імпэрыялістычных «цудаў» бягучай вясны, выключна багатай камбінацыямі і нават звышкамбінацыямі,—турнэ чэхаславацкага міністра, бязумоўна, азначае пэўную чыннасьць.

Важна тут не дэманстрацыйна-паказальны бок яго падарожжа ў Бэрлін, на што асабліва зьвяртаюць увагу нямецкія неімпэрыялісты, адзначаючыя першае (першае пасьля вайны) наведаньне Бэрліну чэхаславацкім міністрам, як доказ росту вялікадзяржаўнай значнасьці Нямеччыны. Таксама ня трэба пераацэньваць і той факт, што Бэнэш абмінуў Парыж, бо гэта можа нават і пажадана было для француcкіх прыхільнікаў Чэхаславакіі, як манэўр разьведвацельнай працы ў Бэрліне.

Важны ня гэтыя тактычныя моманты, а ўнутраная лёгіка падзей, піхаючых Бэнэша, сьледам за Залескім і амаль адначасна з кіраўніком літоўскага ўраду, на падарожжа ў заходняэўрапэйскія сталіцы.

Падамо, як прыклад, шэраг фактаў.

Польская буржуазея, шляхам падарожжа Залескага ў Рым, спрабавала наладзіць «арганічную» сувязь паміж Коўна і Циранай, г. зн. паміж праблемай польска-літоўскіх адносін і і італьлянскімі імпэрыялістычнымі імкненьнямі ў Албаніі і на ўсёй Балканскай паўвысьпе. Крок—рызыкаваны, але неабходны. Хто, як не варшаўскія кіруючыя колы могуць ведаць, нават у момант міралюбчых скавау на канфэрэнцыі ў Кёнігсбэрзе, што ня сёньня—заўтра польска-літоўскі канфлікт зноў набудзе ўсю сваю вострасьць. Польскую дыплёматыю можна абвінавачваць у сямі сьмяротных грахах, але толькі не ў адным—у адсутнасьці ўпартага жаданьня ўвекавечыць захоп Віленшчыны і ўзяць пад сваю апеку Літву, як «клін» паміж СССР і Захадам.

З гэтага пункту гледжаньня Галуўка, бліжэйшы супрацоўнік п. Залескага, у сваім так нашумеўшым спатканьні не сказаў ніводнага лішняга слова. У сваю чаргу, поўная няўдача перамоў, якія адбыліся ў мінулым тыдню ў Коўні, аб ненападзе і ўзаемным пакрыцьці страт, навочна паказала, што Польшча ні на ёту не адступае ад сваёй ыпрабаванай кёнігзбэрскай тактыкі—правесьці кантрабандным парадкам юрыдычнае прызнаньне захопу Віленшчыны. Але ведаючы загадзя (бо гэта залежыць толькі ад Польшчы), што польска-літоўскі канфлікт з надыходам вясны і набліжэньнем чэрвеньскай сэсіі савету Лігі Нацый зноў набудзе ўсю сваю вострасьць, а польскай буржуазеі патрэбна прыязьнь вялікадзяржаўнай фашысцкай Італіі. Адгэтуль—падарожжа Залескага ў Рым.

Перад вачамі польскай дыплёматыі паўстала наступная схэма. Італія хоча заўладаць Албаніяй,—і як вялікай каштоўнасьцю і як пляцдармам, дзе павінна будзе пачацца праца па ліквідацыі Малой Антанты. Пры выканьні-ж гэтай працы Польшча можа адыграць ролю сэкунданта італьлянскіх імкненьняў, пры чым асноўным пунктам італа-польскага супрацоўніцтва, цэмэнтуемага да таго-ж „ідэалёгічным“ момантам—агульнай фашысцкай верай,—магло-б паслужыць вэнгерскае пытаньне. Мусаліні бясспрэчна згодзен перагледзець Трыянонскі дагавор у карысьць Вэнгрыі.

Але за чый кошт? Зразумела, толькі за кошт Юга-Славіі і Чэха-Славакіі, але ні ў якім выпадку не на страту інтарэсам Румыніі. У сваю чаргу, імкненьні польскай буржуазеі зачапіцца эканамічна і палітычна за дунайска-балканскую сыстэму могуць ажыцьцёвіцца толькі шляхам узмацненьня Вэнгрыі, шляхам перагляду Трыянонскага дагавору і ўстанаўленьня непасрэднай польска-вэнгерскай мяжы.

Такім чынам „супольнасьць“ інтарэсаў з Італіяй бясспрэчна. Нарэшце, і з чыста тактычнага пункту гледжаньня флірт ураду Пілсудзкага з вялікадзяржаўнай Італіяй можа даць Польшчы рэальныя вынікі; гэты флірт, якім-бы ён ня быў, яго яўна-шантажны выгляд у адносіне да Францыі можа прымусіць і п. Брыяна, грунтуючыся на патрэбах яго нямецкай і італьлянскай палітыкі, зноў запаліцца да Польшчы любоўю нацыянальнага блёку і блаславіць яе авансам на новае выступленьне супроць Літвы.

Вось тая схэма, што піхнула Залескага на падарожжа ў Рым. Для Італіі літоўскае пытаньне ня варта касьцей і аднаго фашысцкага стралка, але ў мэтах перагляду Трыянонскага дагавору, у мэтах паслабленьня Францыі на дунайска-балканскім сэктары і, нарэшце, нават толькі за пагоршаньне польска-францускіх узаемаадносін,—за ўсё гэта фашысцкі імпэрыялізм ні хвіліны не задумаецца прынесьці ў ахвяру Літву і «салідарнасьць» у савеце Лігі, у тым выпадку, калі Польшча пажадае стварыць у Літве які-небудзь новы факт накшталт наскоку Жэлігоўскага.

Але з гэтай ідэальна складзенай схэмы вырастаюць сур'ёзныя небясьпекі, перш за ўсё, для Чэха-Славакіі.

Прыязьнь з Польшчай, зразумела, патрэбна кіруючым групоўкам чэхаславацкай буржуазеі, але яна патрэбна як гарантыя супроць магчымасьці аб'яднаньня Аўстрыі з Нямеччынай. У прыватнасьці, Чэха-Славакія ня можа дапусьціць эканамічнага ўкараненьня Польшчы ў дунайска-балканскую сыстэму. Чэха-Славакія, якая атрымала пераважную частку былой аўстра-вэнгерскай прамысловасьці (асабліва аўстрыйскай), працуе амаль выключна на дунайска-балканскія рынкі, дзе ёй усё цяжэй змагацца з канкурэнцыяй італьлянскай прамысловасьці, асабліва тэкстыльнай, аўтамабільнай і машынабудаўнічай. Уцягваць сюды яшчэ і палякаў, зразумела, немагчыма. Але і ў чыста палітычных адносінах грунт польска-італьлянскай прыязьні нявыгадны для Чэха-Славакіі: гэта прыязьнь зрывае надзеі на ажыцьцяўленьне так званай дунайскай канфэрэнцыі, якую Чэха-Славакія ўяўляе сабе ня інакш як пры заняцьці ёю галоўнай ролі.

Вось прычына непакою Бэнэша і яго падарожжа ў Лёндан і Бэрлін. Чэхаславацкаму міністру важна высьветліць, папершае, у якой меры брытанскі імпэрыялізм бласлаўляе далейшае разьвіцьцё польскіх відаў на Італію і, падругое, даведацца, які «агульны» настрой Бэрліна да ідэальнай схэмы Залескага.

Перад намі, такім чынам, звычайная дыплёматычная вылазка, неабходнасьць якой выклікана ўсімі вясеньнямі падзеямі ў імпэрыялістычнай краіне.

Першыя вынікі нямецкіх выбараў.

Лік мандатаў кампартыі павялічыўся на 16.

Буржуазна-фашысцкія партыі пацярпелі паражэньне.

БЭРЛІН, 21-У. Канчатковых вынікаў нямецкіх выбараў яшчэ няма. Сёньня а 6-й гадз. 30 хвіл. раніцы былі вядомы такія неканчатковыя вынікі: **КАМУНІСТЫ АТРЫМАЛІ 61 МАНДАТ** *(у сьнежні 1924 г. камуністы мелі 45 мандатаў), сацыял-дэмакраты атрымалі 150 (у 1924 г.—131), нацыяналісты—72 (проці 111-ці ў 1924 г.), партыя цэнтру—60 (проці 69-ці), народная партыя—52 (проці 51), дэмакраты 25 (проці 32), баварская народная партыя—16 (проці 19), гаспадарчая партыя—23 (11) і нацыянал-сацыялісты—13.*

Такім парадкам, пакуль-што занята 462 месцы. У старым рэйхстазе было 493 дэпутаты.

ГАЛАСЫ МЕНШАВІКОЎ УЗРАСЬЛІ ЗА КОШТ ДРОБНАЕ БУРЖУАЗЕІ. —РАБОЧЫЯ АДДАВАЛІ СВАЕ ГАЛАСЫ КАМПАРТЫІ.

БЭРЛІН, 21-5. У ліку ўжо абраных дэпутатаў у нямецкі рэйхстаг—усе вядомыя лідэры нямецкае камуністычнае партыі, у тым ліку Тэльман, Клара Цэткін, Пік, Штэкер і інш.

Камуністычная партыя ва ўсіх акругах сабрала лік галасоў, які значна перавышае галасы, атрыманыя ў часе выбараў 1924 году ў сьнежні. У выніку па колькасьці пададзеных галасоў камуністычная партыя тым пер соўваецца на адно месца наперад у ліку іншых партый: з пятага месца яна пераходзіць на чацьвертае, якое раней займала народная партыя. Вялікі прырост галасоў у сацыял дэмакратаў тлумачыцца ў значнай меры тым, што галасы дробнабуржуазных выбаршчыкаў, якія галасавалі раней за нацыяналістаў, у большасьці перайшлі да сацыял-дэмакратаў.

АКТЫЎНАСЬЦЬ ВЫБАРШЧЫКАЎ.

ПРАВАКАЦЫЙНЫЯ НАСКОКІ ФАШЫСТАЎ НА РАБОЧЫХ.

БЭРЛІН, 20-5. Дзень выбараў у Бэрліне прайшоў спакойна. Не зважаючы на дождж, процант выбаршчыкаў, браўшых **УДЗЕЛ У ВЫБАРАХ**, вельмі высокі **І ДАСЯГАЕ 80-85 ПРОЦ.**

У зьвязку з апошнімі перадвыбарчымі выступленьнямі, у суботу ўночы ў Бэрліне адбылося некалькі стычак, справакаваных фашысцкімі арганізацыямі (нацыянал-сацыялістамі і «Сталёвым Шлемам»), а таксама атрадамі сацыял-дэмакратычнага саюзу «рэспубліканскага сьцягу». У шмат якіх мясцох паліцыя разганяла дэманстрацыі камуністаў гумовымі кіямі і ў некалькіх выпадках нават страляла па камуністах халастымі патронамі.

Уночы на нядзелю члены арганізацыі «Сталёвага Шлему» разьяжджаючы па гораду на грузавіках, стралялі па рабочых-камуністах, якія расклейвалі перадвыбарчыя плякаты.

Паведамленьняў аб ахвярах пакуль-што няма.

УРАД МАРКСА ПАДАЕЦЦА Ў АДСТАЎКУ.

БЭРЛІН, 20-5. Газэты мяркуюць, што ў ўторак, пасьля таго, як стануць вядомымі канчатковыя вынікі выбараў. урад Маркса падаецца ў адстаўку. Згодна канстытуцыі, рэйхстаг новага складу павінен быць скліканы найпазьней у другой палове чэрвеня.

Вялікі прырост галасоў за кампартыю.

БЭРЛІН, 20-У. Да 12 гадзін ночы былі вядомы наступныя частковыя вынікі выбараў у рэйхстаг па асобных раёнах і гарадох: у лейпцыскім выбарчым раёне, водлуг канчатковых афіцыйных даных, пададзена 754180 галасоў. Кампартыя атрымала 121.390 галасоў (проці 90.840 галасоў у сьнежні 1924 годзе) тым самым — два мандаты (абраны камуністы Юрк Шуман і Пауль Фрэліх).

У 23 выбарчай акрузе (усходня-дусэльдорфскай—ніжні Рэйн) камуністы атрымалі 121.794 галасы, г. зн. выйгралі 26 тыс. галасоў; абрана 2 камуністы—Флянтунг і Эндэ.

У Дрэздэне (у горадзе) пры ўдзеле ў выбарах 77 проц. выбаршчыкаў (на 40 тысяч больш, чымся на папярэдніх выбарах) атрымалі камуністы—42.642 галасы, выйгралі 19 тысяч галасоў.

У 33 акрузе (Гесэн-Дармштадт) водлуг неканчатковых даных, камуністы атрымалі 50.000 галасоў (раней 33.642).

Працэс шахцінскіх контррэвалюцыянэраў.

Другі дзень працэсу.

Допыт абвінавачаных.

МАСКВА, 20-5. На вячэрнім пасяджэньні суда па справе шахцінскага працэсу скончана агалашэньне акту абвінавачаньня, пасьля чаго судовая прысутнасьць распачынае допыт абвінавачваемых.

Абвінавачваемы Беразоўскі — пытае старшыня судовае прысутнасьці тав. Вышынскі,—ці прызнаеце вы сябе вінаватым у высунутых вам абвінавачаньнях?

— Але, пры.наю,—цьвёрда адказвае Беразоўскі.

Таксама цьвёрда адказваюць на запытаньне аб вінаватасьці падсудныя Калганаў, Самойлаў, Бабенка, Чорнакніжнікаў, Башкін, Нікіцін, Пятроў, Матаў, Братаноўскі, Сокалаў. Казарынаў, Баярынаў, Дэтэр, Кржыжаноўскі і Файерман.

Падсудны Пацёмкін, прызнаўшы сябе вінаватым на папярэднім сьледзтве, на гэты раз прызнае сябе вінаватым толькі часткова.

Ня прызнае сябе вінаватым таксама інжынэр Шадлун, адна з найбольш выдатных фігур працэсу, які на папярэднім сьледзтве на запытаньне аб вінаватасьці таксама адказаў станоўча.

— Я прызнаю сябе вінаватым у тым,—гаворыць ён,—што быў членам гэтае арганізацыі, але шкодніцтвам я не займаўся.

— Але вы ў арганізацыі былі?

— Але, быў,—адказвае Шадлун.

Інжынэр Люры, прызнаўшы сябе раней часткова вінаватым, адказвае на запытаньне суду катэгарычным адхіленьнем сваёй вінаватасьці. Падсудныя Ляшкоў і Янка Някрасаў прызнаюць сябе вінаватымі ў тым, што паведамлялі весткі, якія цікавілі чужаземных капіталістаў.

Ляшкоў, аднак, гаворыць, што ён паведамляў гэтыя весткі «ў коле таварышоў», ведаючы, што гэтыя весткі будуць імі перададзены заграніцу. А Някрасаў проста прызнае, што ён перадаваў весткі для заграніцных «гаспадароў».

Нямецкі падданы, абвінавачваемы Бадштыбер прызнае сябе вінаватым толькі часткова. Гутарка з ім вядзецца праз перакладчыка.

Старшынствуючы просіць перакладчыка запытаць у падсуднага, ці прызнае ён сябе вінаватым?

— Не, ён адчувае сябе невінаватым.

— Запытайце ў падсуднага Бадштыбера, ці прызнае ён сябе вінаватым у высунутых яму абвінавачаньнях?

— Часткова.

— У чым уласна?

— Ён ня ведаў, што існавала арганізацыя, якая займалася шкодніцтвам у Савецкай Расеі.

— У чым-жа Бадштыбер прызнае сябе вінаватым?

— Бадштыбер прызнае, што ён даставіў кепскія машыны.

— Ён прызнае, што зрабіў гэта сьвядома?

Бадштыбер нешта з запалам гаворыць панямецку.

— Не,—заяўляе перакладчык,—ён гэта зрабіў несьвядома.

— Чаму-ж ён прызнае сябе часткова вінаватым?

— Таму, што ён узяў грошы ў Кестэра і калі ўзяў грошы, дык нічога не сказаў, што машына дрэнная. Упачатку-ж ён яе прызнаў надобраю.

НАОГУЛ 16 ПАДСУДНЫХ ПРЫЗНАЛІ СЯБЕ ВІНАВАТЫМІ БЯЗ УСЯКІХ АГАВОРАК, 13 ЧАСТКОВА І 24 НЯ ПРЫЗНАЛІ.

Допыт падсудных скончаны.

Старшынствуючы прапануе баком устанавіць далейшы парадак працы.

Парадак далейшае працы суда.

Прадстаўнік дзяржаўнага абвінавачаньня тав. Крыленка прапануе весьці судовае сьледзтва такім парадкам, каб ад расьсьледаваньня прыватных момантаў можна было перайсьці да агульных. Выявіць налічча і пабудову арганізацыі на пэрыфэрыі—у Данбасе, потым перайсьці да характарыстыкі цэнтру ў Харкаве і маскоўскага цэнтру, вылучыўшы ў асобнае пасяджэньне разгляд усіх пытаньняў, якія не падлягаюць агалашэньню і патрабуюць спэцыяльнага разгляду пры зачыненых дзьвярох. Дзейнасьць нямецкіх інжынэраў і тэхнікаў павінна быць абсьледавана асобна.

Японія мяркуе захапіць Манчжурыю.

ТРЫВОГА Ў КІТАЙСКІХ ПАЛІТЫЧНЫХ КОЛАХ.

ПЕКІН. 19-У. Агенцтва Тохо паведамляе, што японскія войсковыя судны прыбылі ў порт Тангу (у 50 кілёмэтрах па чыгунцы ад Цзянцьзіну). Шмат якія японскія рэзыдэнты ў Цзянцьзіне і Пекіне пераяжджаюць у японскі порт Дайрэн і іншыя на далёкай адлеглаасьці ад фронту месцы.

Як паведамляе агенцтва Рэйтэра, нядаўняя тэлеграма з Токіё, згодна якой японскі ўрад абмяркоўвае пытаньне аб недазволе перасоўкі ўзброеных сіл паўночнаў і паўднёўцаў на чыгунцы Цзянцьзін-Мукдэн, выклікала ў пекінскіх палітычных колах ажыўлёныя камэнтары. У некаторых колах гэтую тэлеграму разглядаюць як намёк Чжан-Цзо-Ліну заставацца ў Пекіне і абараняць яго ад паўднёўцаў. Іншыя тлумачаць гэтую тэлеграму, як намер Японіі ня ўпушчаць у Манчжурыю ні паўднёўцаў ні паўночцаў.

Камуністычнае паўстаньне ў Гуандуні.

ШАНХАЙ, 19-5. Водлуг паведамленьняў газэты «Нанкін Таймс» з Аньцыня (галоўны горад правінцыі Аньхуэй), паўстанцкі атрад, кіруемы камуністам Чэн-Зенам, заняў павятовы горад Ленчы. Паўстанцы пакаралі сьмерцю начальніка міліцыі і вызвалілі ўсіх палітычных зьняволеных. Мясцовая ўлада гораду ўцякла.

Паўстанцкія атрады, пад кіраўніцтвам камуністаў, ня спыняюць сваіх апэрацый у павеце Цюншан (у Гуандуньскай правінцыі). Паўстанцкія атрады занялі вёску Цяншань. У павеце Хай-Фын ня спыняюцца суровыя бойкі між урадавай арміяй і рэвалюцыйнай арміяй, кіруемай камуністамі. Рэвалюцыйнае войска заняло порт Свабу (на паўночным усходзе ўзьбярэжжа Гуандуньскае правінцыі), аднак, пад націскам пераважных сіл ворага пасьля крывавае бойкі прымушана было адступіць.

Чжан-Цзо-Лін ня думае пакінуць Пекіну.

ПЕКІН, 19-5. Водлуг паведамленьняў пекінскага японскага органу «Норд Чайна Стандарт», Чжан-Цзо-Лін ізноў заявіў аб сваім жаданьні застацца ў Пекіне.

— Я цьвёрда нарашыў,—сказаў Чжан-Цзо-Лін,—паставіць ўсё на карту ў надыходзячай барацьбе, не зьвяртаючы ніякае ўвагі на мае становішча ў Манчжурыі. Лічачы неабходным давесьці да канца барацьбу проці камунізму.

ЯПОНСКІЯ САМАЛЁТЫ БАМБАРДЫРУЮЦЬ ГАРАДЫ.

ШАНХАЙ, 19-5. Японскія вайсковыя самалёты бамбардыравала горад Тайяр (50 клм. на поўдзень ад Цзынаню па Цзянцьзін-Пукоўскай чыгунцы).

У ЦЗЫНАНІ ЗАБІТА 4.000 КІТАЙЦАЎ.

ТОКІЁ, 19-У. У дакладзе японскага генэральнага консула Цындао Фуцьзіта аб цзынаньскіх падзеях зазначаецца, што лік забітых у Цзынані кітайскіх салдат дасягае да 4 тысяч.

Працэс Беларускае Грамады.

Апошняе слова падсудных.

Прысуд будзе ўхвален сёньня.

(Ад уласнага карэспандэнта на працэсе).

ПАДСУДНЫ МЯТЛА *зазначае, што пракурор няправільна палічыў прыбыткі і выдаткі беларускае прэсы.*

РАК-МІХАЙЛОЎСКІ *спыняецца на пытаньні аб беларускай школе. Ён зазначае, што ў той час, як на тэрыторыі Заходняе Беларусі павінна быць 2.500 школ, на справе ёсьць толькі 2 школы. Рак-Міхайлоўскі пачынае гаварыць пра дапамогу палітычным вязьням. У гэты час старшыня суду перарывае яго некалькі разоў.*

АБВІНАВАЧАНЫ ВАЛОШЫН *кажа, што дапамогу для палітычных вязьняў ён арганізаваў з ведама пракурора. У свой час улада астрогу выдала яму сьпісы зьняволеных вязьняў. Цяпер яго абвінавачваюць у тым, што ён даваў дапамогу шпіёнам.*

ДЭПУТАТ МЯТЛА *апявядае свой жыцьцяпіс. Ён сын селяніна. Перад вайною ён быў настаўнікам. Няпраўду гаварыў пракурор называючы яго русіфікатарам. Мятла спыняецца на характарыстыцы паліцэйскіх агентаў і правакатараў.*

Наша становішча,—заяўляе Мятла,—сапраўды бязвыходнае. Калі мы займаемся палітыкаю, дык кажуць, што гэта камунізм. Займаемся мы эканамічнаю працаю—гэта ізноў-жа камунізм.

АБВІНАВАЧАНЫ АСТРОЎСКІ *гаворыць вялікую прамову, якая робіць моцнае ўражаньне.*

Пасьля яго выступаюць з апошнім словам абвінавачаныя **АПІНЧЫК, ЮШКЕВІЧ, ПІНЯК, ШКОДЗІК І НЕКАТОРЫЯ ІНШЫЯ.**

ЛУЦКЕВІЧ І КОЎШ АД АПОШНЯГА СЛОВА АДМОВІЛІСЯ.

На гэтым скончан судовы разгляд справы.



Апошняе слова падсуднага Мятлы.

Працэс вілейскіх „грамадаўцаў“.

У працягу ад 11 да 13 мая г. г. ў Вілейцы адбываўся суд над «грамадаўцамі» з вёсак Малыя Запруды і Піліпіняты Забярэскай вол. Абвінавачаныя, у колькасьці 21, адказвалі па 102 арт. К.К. Папярэдне яны прасядзелі да суду па 16 месяцаў у вастрозе. Трое абвінавачаных прысуджаны на 3 гады катаргі, 7—на 2 гады, рэшта на паўтара гады і адзін—на 1 год.

Прыезд літоўскае дэлегацыі ў Варшаву.

ВАРШАВА, 19-У. У Варшаву прыехала літоўская дэлегацыя на працы польска-літоўскае камісіі па эканамічных пытаньнях, а таксама па пытаньнях транзіту і шляхоў зносін.

Цяжкія прысуды.

Ваенны суд у Расіэнах прыгаварыў 12 асоб у астрог ад паўтара да 12 гадоў, падсудныя былі абвінавачаны ў падрыхтоўцы замаху проці ўраду Вальдэмараса у верасьні 1927 г.

Сярод абвінавачаных знаходзіцца таксама б. пасол сойму Жукаўскас, якога засудзілі на 12 гадоў.

Усеагульная забастоўка ў Швэцыі

На 22 мая ў Швэцыі назначана ўсеагульная палітычная забастоўка.

Швэцыя ня ведала ўсеагульнай забастоўкі з 1909 году. Тагочасная ўсеагульная стачка, выкліканая эканамічнымі прычынамі, пацярпела лютае паражэньне, якое ўзмацніла пазіцыю рэфармістаў у швэдзкім рабочым руху.

Забастоўка 22 мая, палітычная забастоўка, наносіць мацнейшы ўдар непадзельнаму панаваньню рэфармізму. Чаму рэфармісцкі савет прафсаюзаў і ЦК сацыял-дэмакратычнай партыі былі прымушаны абвясьціць усеагульную забастоўку?

23 мая лібэральны ўрад Швэцыі ўносіць у парлямант законапраэкт аб вырашэньні працоўных канфліктаў шляхам абавязковага арбітражу. Гэта азначае фактычную забарону забастовак ці, у кожным разе, прадастаўленьне ўраду права ў любы момант прыдушыць пачатую забастоўку.

Швэдзкі законапраэкт не зьяўляецца арыгінальным. Маленькая Швэцыя ў гэтым выпадку проста бярэ прыклад з «вялікіх» дзяржаў. Прымусовы арбітраж фактычна існуе ў Нямеччыне, дзе міністэрства працы можа абвясьціць і абвяшчае любую пастанову заміраючай камэры абавязковай.

Швэцыя ня бачыць падстаў „адставаць“. Лібэральны ўрад добра ведае, што сацыял-дэмакратыя, якая зьяўляецца буйнейшай апазіцыйнай, ды і наогул буйнейшай партыяй парляманту, ні на які сур'ёзны адпор ня пойдзе. Аднак, рэфармісцкі савет прафсаюзаў усё-ж абвяшчае ўсеагульную забастоўку. Зразумела, гэта тлумачыцца не рэвалюцыйнасьцю рэфармісцкіх правадыроў. У самым савеце прафсаюзаў маецца вельмі значная камуністычная меншасьць. Уплыў камуністаў у асобных прафсаюзаў вельмі вялікі. Пастанова савету прафсаюзаў выклікана моцным націскам зьнізу, з боку радавых членаў прафсаюзаў.

Аднак, выконваючы гэта пажаданьне, прафсаюзныя правадыры і тут спыняюцца на поўдарогі. Яны стараюцца зрабіць з усеагульнай забастоўкі простую дэманстрацыю, яны дамагаюцца таго, каб забастоўка была толькі аднадзённай. Камуністы і левая меншасьць прафсаюзаў патрабуюць правядзеньня доўгай палітычнай забастоўкі, якая прывяла-б да перамогі.

Сёньня—прысуд па справе беларускай грамады.

Сёньня ў Вільні ў душнай судовай залі польскі суд вынясе свой прыгавор над 56 беларусамі, якіх польская ахранка вырвала з народнай гушчы і вось ужо каля паўтара гады трымае ў астрозе.

Іх вінавацяць у тым, што яны «ўзялі ўдзел у змове пад назваю „Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада“, якая ставіла мэту засноўваць на тэрыторыі ўсходніх земляў савецкі лад, адарваць гэтыя землі ад Польшчы і далучыць іх да Савецкай Расеі».

Падругое — іх абвінавачваюць у тым, што яны «ўзялі абавязацельства ў адносінах да суседняе дзяржавы».

Адным словам—ім закідаецца справа дзяржаўнай здрады: змовы з гэтаю мэтаю з суседняй дзяржавай, г. ё. з намі.

Сёньня польскі суд адкажа на гэтыя пытаньні тым ці іншым прыгаворам. Ён афіцыяльна выкажа ўрадавы пункт погляду на правы беларускага народу да жыцьця і змаганьня за свой твар і існаваньне ў Польшчы.

Мы добра ведаем, што ў Польшчы ёсьць канстытуцыя, якая гарантуе на паперы правы ўсім нацменшасьцям, а ў тым ліку і беларусам. Выходзіць як быццам так, што ўсім нацменшасьцям у Польшчы, належаць усе іх правы. На справе мы бачым нешта зусім іншае і нават ня іншае, а зусім адваротнае. Нацменшасьці, а асабліва беларуская, трактуюцца ў Польшчы горш як рабы. Ім ня толькі нічога не даюць, ад іх адабралі польскія паны ўсё што можна адабраць: школу, культуру, быт, мову, жаданьне жыць згодна з сваімі нацыянальнымі імкненьнямі,—адным словам—усё тое, што „загарантавана“ і польскай канстытуцыяй і рознымі трактатамі.

Сядзяць на лаўцы тыя беларусы, якія паверылі ў моц гэтых канстытуцый і трактатаў і над імі робяць сёньня расправу тыя, хто ад пачатку проста наплявалі на гэтыя канстыуцыі і трактаты.

Карыстаючыся старымі, даўно ўжо аджыўшымі царскімі законамі, яны сёньня вынясуць прыгавор над беларускім адраджэнчым рухам, які мае такое-ж права на існаваньне, як і польскі адраджэнчы рух, асабліва калі яго прыгняталі царызм пры помачы тых-жа самых законаў, якія практыкуюць цяпер польскія паны.

Тое, што ў даўныя часы лічылася польскімі панамі і нават усім польскім грамадзянствам чымсьці агідным у адносінах да польскага адраджэньня, за што польскія рэвалюцыянэры ішлі на катаргу і нават эшафот,—за тое самае цяпер у панскай Польшчы найлепшых беларускіх барацьбітоў трымаюць у вастрогах і судзяць.

Які-б ня быў прыгавор, якія-б ня былі драконаўскія прысуды і ў гэтым працэсе і ў іншых, вынік з усяго гэтага будзе адзін,—даўно ўсім вядомы: гэтыя прысуды ўзложаць на галовы барацьбітоў за беларускае адраджэньне новыя вянкі з найлепшых кветак беларускай зямлі.

Замежны.

Лінейная калібровочная мішень LRT-BE4-V2

ПРАТЭСТУЕМ СУПРОЦЬ ГВАЛТУ НАД БЕЛАРУСКАЙ ГРАМАДОЙ.

Слава храбрым абаронцам працоўных Заходняй Беларусі.

Сход украінскіх і беларускіх пісьменьнікаў разам з працоўнымі г. Менску выносіць свой пратэст супроць суду над прадстаўнікамі Сялянска-Рабочай Грамады, якія паставілі сваёй мэтай пасільна абараняць у легальнай форме інтарэсы сялянскіх мас Заходняй Беларусі.

Мы ўпэўнены, што настане час, калі рабочыя і сяляне Заходняй Беларусі будуць судзіць сваім строгім судом буржуазею, паноў, жандараў і паліцыю, якія ўціскаюць пралетарыят і сялянства ўсіх народаў панскай Польшчы.

Сьмерць катам і забойцам прадстаўнікоў рабочых і сялян Заходняй Беларусі!

Слава грамадаўцам—храбрым абаронцам працоўных мас Заходняй Беларусі!

Прэч польскіх фашыстаў.

З-ці Ўсебеларускі зьезд інжынэраў і тэхнікаў, які выказвае волю 3500 яднаных членаў інжынэрна-тэхнічных сіл, ня можа абыйсьці моўчкі тых зьдзекаў, якія праводзяцца польскім фашысцкім урадам над прыгнечанай рабочай клясай і сялянствам Заходняй Беларусі ў асобе Грамады, якую польскі фашысцкі ўрад пасадзіў на лаўку падсудных.

Мы таксама катэгарычна пратэстуем супроць арышту т. Сахацкага, які зьяўляецца прадстаўніком рабочай клясы Польшчы.

Мы, інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі, зьяўляючыся часткай саюзных арганізацый, выказваем свой рашучы пратэст супроць барбарскіх зьдзекаў—супроць суду над Беларускай Грамадой.

Адначасова заклікаем усю працоўную інтэлігенцыю Заходняй Беларусі і Польшчы ўзьняць свой магутны пратэст і дабіцца вызваленьня арыштаваных дзеячоў Беларускай Грамады і спыненьня судовай расправы над імі.

Прэч польскі фашысцкі ўрад!

Няхай жыве адзінства рабочых і сялян Савецкай Беларусі з рабочымі і сялянамі Заходняй Беларусі!

Няхай жыве камуністычная партыя!

Пратэстуем супроць фашысцкага прысуду.

Мы, прапоўныя Чарэйшчыны, катэгарычна пратэстуем супроць гвалту польскіх паноў над Рабоча-Сялянскай Беларускай Грамадой, прадстаўнікі яной ужо доўгі час мучацца ў засьценках белай Польшчы. Мы пратэстуем супроць прысуду, які падрыхтован фашысцкім польскім судом абаронцам інтарэсаў працоўных Зах. Беларусі—грамадаўцам. Мы заклікаем пралетарыят Польшчы і іншых краін аказаць барацьбітам рэвалюцыі ўсямерную дапамогу і не дапусьціць зьдзеку над прадстаўнікамі Грамады.

„Пілсудзкі павінен вызваліць грамадаўцаў".

За апошні час да нас прыйшлі новыя весткі аб тым, як замежны пралетарыят адносіцца да суду над Грамадой.

У апошні час усё часьцей і часьцей пошта пачала прыносіць нам газэты в розных краін, дзе зьмешчаны артыкулы альбо адозвы аб Грамадзе.

Амэрыканская рабочая газэта „The Daily Worker" у нумары ад 2 красавіка 1928 г. у невялікім артыкуле паведамляе аб утварэньні ў Амэрыцы «нацыянальнага камітэту для барацьбы з польскім фашызмам». У склад гэтага камітэму ўвайшлі праф. Робэрт Морс Ловэ (Чыкага), Рогер Балдвін (Монр), праф. С. Неарынг, Р. Дун, М. Авэрт (Межрабпом), Ткач ад рабочых ўкраінскіх арганізацый, Г. Крупіца ад беларускіх арганізацый, Г. Кострэль, Радванскі ад „Grybuna Robotnitzal". Прусэйка ад літоўскага літ. т-ва, М. Ольгін і інш. Гэты камітэт зьвярнуўся да ўсіх з адозваю, заклікаючай да барацьбы з польскім фашызмам. Камітэт паслаў свой пратэст Пілсудскаму супроць суда над Грамадой.

Аб арганізацыі гэтага камітэту паведамляе галяндзкая газэта «De Tribune», якая ў сваю чаргу ў нумары ад 25 красавіка цалкам зьмяшчае адозву к-ту па абароне Грамады БССР, атрыманую з Менску на мове эспэранто.

Разасланыя праз эспэрантыстаў адозвы—папалі ва ўсе краіны, нават у такі, дзе пануе жудасны фашысцкі тэрор. У паўднёва-слаўскай газэце «Организовани Родник» у нумары ад 22 красавіка 1928 г. зьмешчана адозва к-ту па абароне Грамады, атрыманая таксама з Менску на мове эспэранто.

— Нямецкая газэта «Mahrunt» орган Межрабпому ў нумары 8 за другую палову красавіка зьмяшчае таксама цалкам адозву камітэту па абароне Грамады.

— Галяндзкая «De Tribune» у нумары ад 8 мая ў артыкульчыку «Тэрор Пілсудзкага»—апісвае палітычны шпіёнаж у Польшчы, на якім пабудавана ўсё абвінавачваньне Грамады. Гэткімі сродкамі Пілсудзкі хоча задушыць беларускі народ.

— «Пілсудзкі павінен вызваліць бязьвінна арыштаваных грамадаўцаў. Камэдыя суду, інсцэніраваная польскімі фашыстамі, падыходзіць да канца. Ці не даволі ўжо глуміцца над прадстаўнікамі чатырохмільённага беларускага народу. Мы патрабуем вызваленьня непавінных грамадаўцаў»,—так пішуць у сваім лісьце да польскага ўраду рабочыя мэталісты Гётэборгу ў Швэцыі.

Швэцыя, Нямеччына, Францыя, Латвія, Англія, Амэрыка, Паўднёвая Славія, Галяндыя і шмат іншых краін узьнімаюць свой голас у абарону Грамады.

Ляцяць лісты, тэлеграмы, пратэсты да Пілсудзкага і ў суд з адзінным патрабаваньнем— вызваліць непавінных барацьбітоў. Але Пілсудзкі нібы новаяўлены польскі фулер—маўчыць. Камэдыя падыходзіць да канца.

Пралетарыі чакаюць прысуду, каб яшчэ з большай сілай пратэставаць супроць зьдзекаў над сялянамі і рабочымі Заходняй Беларусі.

Зьм. Сьнежка.

У АБАРОНУ ГРАМАДЫ.

(*Вечар беларускіх і украінскіх пісьменьнікаў у Доме Культуры*).

Адчыняецца заслона...

У прэзыдыуме—украінскія і беларускія пісьменьнікі.

— Лічу наш сход, прысьвечаны пратэсту супроць суду над Беларускай Грамадой, адчыненым,—заяўляе т. Ігнатоўскі.

— Сёньня мы ўсе чыталі апошнюю прамову т. Тарашкевіча. Гэта прамова гаварылася не для суду, а для сялянскіх мас Заходняй Беларусі, для тых мас, якіх прадстаўляе Беларуская Грамада. З прамовы яскрава відаць, што рух рабочых і сялян Заходняй Беларусіня ня ёсьць вынік агітацыі Камінтэрну. Рэвалюцыйны рух працоўных Заходняй Беларусі—гэта вынік эканамічнага і нацыянальнага ўціску фашысцкага ўраду Польшчы над нашымі братамі—рабочымі і сялянамі.

Далей т. Ігнатоўскі пераходзіць да камэдыі суду ў Вільні і кажа:

— Нам ясна, што прадстаўнікоў беларускага народу засудзяць, бо над імі робіць расправу фашысцкі суд, прызначэньне якога—распраўляцца з рабочымі і сялянамі ва ўсім буржуазным сьвеце.

У аднэй з варшаўскіх газэт адзін з супрацоўнікаў гэтай газэты ў сваім артыкуле зьвярачаецца да пракурора суду ў Вільні з такімі словамі: «Пане пракурор! Ты працэс выйграеш, але выйгрыш пракуратуры будзе вялікім паражэньнем польскай палітыкі на крэсах».

Не, ня ўраду фашыстаў паправіць палітыку на крэсах. Калі той, хто зараз судзіць рабочых і сялян Заходняй Беларусі, сядзе на лаўку падсудных, і яго будуць судзіць працоўныя, — толькі тады зьменіцца палітыка на крэсах і, наогул, у Польшчы.

Фашысты засудзяць грамадаўцаў, але мы скажам:

— Якая цяжкая кара ня была-б наложана, яна будзе наложана на працоўныя масы Заходняй Беларусі за тое, што яны жадаюць лепшага жыцьця.

Пасьля тав. Ігнатоўскага выступіў старшыня дэлегацыі украінскіх пісьменьнікаў т. Піліпенка.

— Мы толькі што езьдзілі на граніцу БССР з Польшчай, каб сваімі ўласнымі вачыма паглядзець на адарваную частку ад цела Беларусі—на Заходнюю Беларусь.

Украіна, як і Беларусь, таксама разарвана на 2 часткі, і гэта становішча яшчэ больш яднае нашы народы. Нас яднае таксама і тое, што мы з вамі можам гаварыць і абменьвацца думкамі без тлумача.

Працоўныя Украіны разам з вамі абураны агідным судом над Грамадой. Пратэсты абурэньня мы выносілі ў сябе, на Украіне, а зараз мы шчасьлівы, што равам з вамі яшчэ раз можам паслаць праклёны фашысцкаму ўраду Польшчы.

Далей т. Піліпенка апавядае сходу аб тым, што ўбачыла дэлегацыя украінскіх пісьменьнікаў у Савецкай Беларусі.

— Мы ўбачылі, як ва ўсе шчыліны жыцьця прасякае сацыялістычнае будаўніцтва. Мы ўбачылі, як сярод балот вырастае вялікі і магутны Асінастрой, які дасьць электрычную энэргію на дзесяткі вёрст у розныя бакі. Няма ніводнай галіны культурнага і гаспадарчага будаўніцтва, дзе БССР ня мела-б надзвычайных посьпехаў. Савецкая Беларусь шпаркімі крокамі ідзе наперад, і мы з гонарам гэта раскажам на Украіне.

Гэты буйны рост культурнага і гаспадарчага будаўніцтва ня толькі ў БССР, але ва ўсім Саюзе зьяўляецца магутным штурхачом для працоўных усяго сьвету.

Мы бачым, як насьпявае час, калі працоўныя паўстануць супроць буржуазэі і зьмятуць яе.

На трыбуне дэлегацыя ад 3-га Ўсебеларускага зьезду інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў, якая ад імя зьезду далучаецца да пратэсту працоўных Менску. Адзін з прадстаўнікоў дэлегацыі зачытвае рэвалюцыю-пратэст, якую прыняў зьезд з повады працэсу Беларускай Грамады.

Мітынг скончаны...

Адзін за адным выступаюць украінскія і беларускія песьняры, якія дэкламуюць свае творы. Асабліва горача быў спатканы верш нашага песьняра Андрэя Александровіча,— «Беларуская марсэльеза перад польскім судом», а таксама верш украінскага пісьменьніка Паліпчука — «Чырвонаармейскі марш».

«Сьміла в ногу, на Вільню, у дарогу... Раз... Два...»

Гэты верш так узьняў настрой усёй залі, што, здавалася, скажы хто—«ідзём на Вільню»—і ўсе, як адзін, рухнулі-б вызваляць лепшых прадстаўнікоў працоўных Заходняй Беларусі.

У заключэньні сход ухваліў рэзалюцыю-пратэст супроць гвалтаў фашысцкага польскага ўраду над Беларускай Грамадой.

Выправім недахопы.

(Да 1-га тыражу выйгрышаў па пазыцы ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі).

Праца па распаўсюджваньні пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі скончана. Па нядоўных вестках, на 7 мая 1928 г. сума рэалізацыі пазыкі па БССР складае 2.315.557 р. 50 к. Гэта лічба яскравы доказ таго, наколькі шырокія працоўныя масы сялянства разумеюць ролю і значэньне пазыкі для народнае гаспадаркі і выгады яе для кожнага селяніна. Можна з упэўненасьцю сказаць, што ў шмат раёнах працоўныя масы сялянства з поўнай сьвядомасьцю аддалі свае выбаражэньні і часова вольныя сродкі ў пазыку дзяржаве.

Фактычная рэалізацыя пазыкі ў большасьці раёнаў пачалася ў лютым. Блізкасьць вясны і зьвязанае з ёю бездарожжа, якое ў большасьці перашкаджае сувязі гораду з вёскай, настойліва вымагалі прысьпяшэньня тэмпу рэалізацыі пазыкі. Неабходнасьць скончыць кампанію ў найкарацейшы тэрмін прыдала ёй ударны характар. Ва ўсякай вялікай справе, а распаўсюджваньне пазыкі зьяўляецца вялікай справай, няўхільны памылкі.

Пытаньне ціпер у тым, каб дапушчаныя недахопы і памылкі ў часе кампаніі зараз-жа выправіць. Практычна гэта адзначае—даказаць селяніну выгаднасьць аблігацый пазык, даказаць яму, што сродкі, якія ўложаны ў пазыку, прынясуць яму выгады. З гэтага пункту погляду выключна важнае значэньне набываюць тыражы выйгрышаў, якія пачаліся з 15-га мая ў 55-ці пунктах СССР.

Тыражы павінны зьявіцца пачатковым момантам агітацыйнай працы, маючай мэту папулярызаваць пазыку. Тыражы зьяўляюцца найлепшым паказчыкам таго, наколькі даклада і акуратна Савецкі Ўрад выконвае свае абавязкі перад шырокімі масамі працоўнага сялянства.

Трэба зараз-жа, не адкладаючы, прыступіць да шырокага растлумачэньня выгад ад пазыкі, а таксама і значэньня тыражу. Неабходна, каб сялянства ня толькі ведала аб тыражу, але і само прымала актыўны ўдзел у яго правядзеньні. Апроч 10-ці сялян, якія будуць уключаны ў тыражную камісію, трэба дабіцца, каб шляхам экскурсій і дэлегацый сялянства наведала тыраж, каб яно пераканалася, з якой дакладнасьцю ён праводзіцца. Што выйгрышы па пазыках ня ёсьць міф, а зусім рэальная справа.

Па сканчэньні тыражу праца ні ў якім выпадку не павінна аслабнуць. Трэба в дню ў дзень даказваць селяніну выгаднасьць захаваньня аблігацый у яго на больш доўгі тэрмін.

Для гэтай працы неабходна скарыстаць усе сілы. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на працу шэфскіх таварыстваў і адпускнікоў, якія тысячамі паедуць у вёску.

Толькі ўпартай працай ўсіх нашых партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый мы зможам выправіць нашы недахопы і тым самым замацаваць той агромадны посьпех, які мы набылі ў справе ўцягненьня сялянскіх зьберажэньняў на сацыялістычнае будаўніцтва нашай краіны.

А. Львоў.

Да прыезду украінскіх песьняроу у Менск.

Украінскія і беларускія песьняры з супрацоўнікамі газэты „Савецкая Беларусь".

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

ЯК ІДЗЕ САМААБКЛАДАНЬНЕ.

(Па вестках на 15-е мая).

АКРУГІ	Заданьне	Прынята на праведзеных сходах	% % да заданьня	Паступіла	% % да прынятай сумы
Мазырская	210.000	244.690	122,3	200.261	81,8
Віцебская	250.000	251.645	100,7	140.254	55,7
Аршанская	350.000	350.002	100,0	253.640	72,5
Полацкая	190.000	187.721	98,8	64.618	34,4
Гомельская	350.000	319.691	91,3	116.477	36,4
Бабруйская	500.000	410.200	82,0	210.200	51,2
Магілеўская	500.000	409.227	81,8	124.432	30,4
Менская	560.000	425.066	75,9	88.984	18,3
УСЯГО па БССР	2.910.000	2.588.242	88,9	1.198.866	46,3

АДКАЗНЫЯ ПРАЦАЎНІКІ НА ВЁСКУ.

Барысаў. У зьвязку з тым, што некаторыя сельсаветы нядбайна адносяцца да спагнаньня грошы на самаабкладаньні, РВК 20 мая вылучыў 20 адказных працаўнікоў і накіраваў у вёску для тэрміновага спагнаньня грошай.

Сябра Зачыцкага сельсавету Данілоўіч Віктар, які пагражаў сялянам і вёў агітацыю сярод іх, каб не плацілі грошай, аддаецца над суд.

Заданьне, дадзенае з боку АВК па спагнаньні грошай, будзе выканана не пазьней 1 чэрвеня.

НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ.

Барысаў. Лошыцкі сельсавет першы ва ўсім райёне правёў самаабкладаньне ў вёсках на 1438 руб. 34 к. На сёнешні дзень спагнаў 987 руб. 77 кап.

Як выросла гаспадарка.

(Савецкая гаспадарка Ліпаў).

Горкая доля была савецкай гаспадаркі Ліпаў (Калінкавіцкі р., Мазырскай акругі) у пэрыяд да жніўня 1927 г., і асабліва цяжкія ўмовы жыцьця 1922-23 г. г., калі кіраўніком быў нейкі Мыко.

Гэты «разумны» гаспадар распрадаў багаты інвэнтар, якія застаўся пасьля выехаўшага ўласьніка. Сьведкі былой безгаспадарнасьці—часткі машын валяюцца па шляху Ліпаў—Калінкавічы.

Да жніўня 1927 году, калі гаспадарка была яшчэ вельмі малая, не праводзілася ніякай культурна-асьветнай працы,—у клюбе працякаў дах, панура паглядалі рабочыя, акаляючыя сяляне рабілі патравы, пені не плацілі па 3-4 месяцы.

Невясёлае было жыцьцё, скоса паглядвалі на незасеяную зямлю (якой пуставала з 9 палёў 3-4 поля).

Сяляне на ўсіх сходах патрабавалі ліквідацыі гаспадаркі. Не дапамаглі і грошы трэсту—ня было гаспадара. У жніўні 27 г. кіраўніком быў назначан Г-к.

Адразу мяняецца гаспадарка, гэта асабліва відаць таму, хто бачыў савгас у мінулым.

Кароў зараз маецца 25, маюцца сродкі яшчэ на 16. Прыбавілася коняй на 6 шт., пастаўлена воўначоска, якая адразу прыцягнула ўсё насельніцтва. Апрацоўка воўны рабілася па 6 кап. за 400 гр., калі прыватнік браў па 16 кап.; гэта прымусіла яго зьнізіць цану.

Лекцыі і гутаркі кіраўніка-агранома робяць вялікі ўплыў на акаляючае сялянства. Калі што здараецца ў сялян, яны ідуць у савгас, каб параіцца з кіраўніком, што рабіць. Абсталяваны клюб, наладжана радыё. Усё гэта зьмяніла погляд сялян на савгас, і тыя сяляне, якія крычалі, што ня трэба савгасу,—цяпер кажуць іншае. Зараз ёсьць куды пайсьці за парадай, ёсьць з каго ўзяць прыклад.

А. П.

Падарожжа тав. Галадзеда па БССР.

Старшыня СНК БССР тав. Галадзед выехаў у Мазырскую і інш. акругі. У гэтым падарожжы прымаюць удзел рэдактар газэты „Савецкая Беларусь" т. Кудзелька і Народны Камісар Земляробства т. Прышчэпаў.

ТАВ. ГАЛАДЗЕД У МАЗЫРЫ.

(Ад нашага Мазырскага карэспандэнта).

Сёньня ў Мазыр прыехалі старшыня Савету Народных Камісараў Галадзед, Народны Камісар Земляробства Прышчэпаў і паэта Міхась Чарот.

На вакзале прыехаўшых спаткалі прадстаўнікі акрвыканкому, партыйных і прафэсыянальных арганізацый і дэлегацыі рабочых.

Галадзед, вітаючы працоўных Мазыршчыны, зазначыў, што яго прыезд мае на мэце вывучэньне гэтага багатага, але недасьледванага краю Палесься.

Пяцігадовы плян будаўніцтва.

ВОРША. У пяцігодцы будаўніцтва на Аршаншчыне мяркуецца зрабіць наступнае. Па лініі сельскай гаспадаркі будуць прыняты мерапрыёмствы па лепшай апрацоўцы зямлі, машынізацыі, павялічэньні ўраджайнасьці. У сувязі з гэтым будзе пабудаваны цэлы шэраг прадпрыёмстваў па пераапрацоўцы сельска-гаспадарчай сыравіны. Будзе пабудавана 5 мэханізаваных масларобчых сыраварных заводаў, плады сушыльні, экстрактны завод і цэлы шэраг сельскіх электрастанцый. Будзе пашыраны арганізацыя арцеляў, камун і калгасаў і г. д.

У 1929 годзе будзе засеяна 391779 дзесяцін, у 1933 г.—431965, павялічэньне на 12,9 проц. проці гэтага году.

На камунальнае будаўніцтва ў 1928-29 годзе будзе выдана 453 тысячы руб., а ў 32-33 годзе—842 тысячы руб.

На асьвету будзе выдана ў 1928-29 годзе 1.166.703 р., у 1932-33 г. 2 255.685 р. Зарплата школьных працаўнікоў павялічыцца на 25—30 проц.

Праз курсы—на самастойную кіруючую савецкую працу.

За апошнія годы, па дырэктывам партыі і савецкай улады, шляхам выбараў, сотні працоўных жанчын работніц і сялянак вядуць сталую практычную працу ў розных савецкіх установах. І ня толькі ў савецкіх. Працоўная жанчына Савецкай Беларусі заваявала сабе досыць значнае месца ва ўсёй нашай грамадзкай працы; яна досыць актыўны ўдзел прымае ў працы саветаў, выканаўчых камітэтах, каапэрацыі, кресткомах і розных іншых грамадзкіх арганізацыях. На практычнай працы выкавалісь, загартаваліся шэраг работніц і сялянак. Яны поплеч з грамадзкім работнікам, мужчынай, нясуць адказную і пачэсную працу ў справе сацыялістычнага будаўніцтва. Шмат выкавалася незамянімых грамадзкіх дзеячоў з жанчын пасьля Кастрычнікавае рэвалюцыі ва ўсіх галінах нашай працы. Зразумела, што мы гэтым ня можам задаволіцца. **Нам трэба ўсьлед за адзінкамі падрыхтаваць да савецкай і грамадзкай працы самыя шырокія шэрагі работніц і сялянак усіх нацыянальнасьцяй, ставячы лепшых з іх на адказную, самастойную кіраўнічую працу.** Зьезды жанчын—членаў саветаў, якія адбыліся ў мінулым годзе, паказалі нам, як палітычна выраслa савецкая працоўная жанчына наогул; разам з гэтым на гэтых зьездах адзначалася, што **асноўнай прычынай слабага, недастатковага высоўваньня працоўных жанчын на адказную працу зьяўляецца недастатковая тэхнічная і агульнакультурная пісьменнасьць жаночага актыву.**

Пры сучасных складаных умовах працы саветаў ва ўсіх галінах нашага будаўніцтва ад усіх савецкіх і грамадзкіх працаўнікоў патрабуецца поўнай напружанай энэргіі, палітычнай сьвядомасьці, культурнасьці і тэхнічнай пісьменнасьці.

Таму перад намі паўстала задача,—у шэрагу розных сярэдніх школ, вуз'аў, усякіх іншых курсаў, якія рыхтуюць нам працаўнікоў, прыступіць да сыстэматычнай падрыхтоўкі жанчын для сталай адказнай кіруючай працы.

У мэтах падрыхтоўкі работніц і сялянак—сьвядомай саветаў да вылучэньня на самастойную кіруючую савецкую работу, падрыхтоўкі іх да актыўнага ўдзелу ў будучых перавыбарах саветаў, прэзыдыум ЦВК пастанавіў арганізаваць з 10 чэрвеня 3-хмесячныя ўсебеларускія курсы жанчын членаў саветаў, колькасьцю на 60 чалавек.

Па сацыяльнаму складу слухачы арганізуемых курсаў разьмяркоўваюцца на 12 работніц, 28 сялянак, 8 батрачак, 8 членаў калхозаў і 4 работніцы савгасаў. Гэтыя курсанткі будуць знаходзіцца на поўным утрыманьні савецкай дзяржавы: яны забясьпечваюцца кватэрай і харчаваньнем, сродкамі на праезд з курсаў. Апрача таго, працуючыя з іх па найму будуць атрымліваць сваю сярэднюю заработную плату, а тыя, якія не атрымоўвалі ніякай пэнсіі, будуць атрымліваць на курсах па пятнаццаць рублёў у месяц.

На курсы павінны пасылацца выключна жанчыны, выбраныя ў саветы і выканаўчыя камітэты, як знаходзячыяся ў вытворчасьці, гатак і працуючыя ў савецкіх установах і грамадзкіх арганізацыях на сталай практычнай працы. Усе камандыруемыя на курсы жанчыны павінны ўмець чытаць і пісаць. Вось галоўнейшыя ўмовы для курсантак ўсебеларускіх курсаў жанчын.

Зразумела, што дасягненьне мэтаў, якія стаяць перад курсамі, залежыць раней усяго ад найлепшага падбору кандыдатур. Таму саветы і выканаўчыя камітэты гэтай справе павінны ўдзяліць выключную ўвагу і паслаць на курсы тых работніц, батрачак і сялянак членаў саветаў, якія найбольш актыўна праявілі сябе на практычнай савецкай і грамадзкай рабоце, якія пасьля сканчэньня курсаў з посьпехам змогуць быць накіраваны на адказную савецкую працу.

Маючы на ўвазе агромністае значэньне правільнага падбору курсантак, якія праз курсы стануць на адказную працу ў савецкіх установах ад сельсавету да цэнтру, трэба на месцах прыцягнуць да абмеркаваньня іх савецкія, прафсаюзныя і іншыя грамадзкія арганізацыі.

Пленумы і прэзыдыумы саветаў і выканаўчых камітэтаў павінны ўсебакова абмеркаваць пасылаемыя кандыдатуры. Вельмі пажадана, каб гэтыя курсанткі, члены саветаў, будучыя адказныя працаўнікі савецкага і грамадзкага будаўніцтва, былі абгаворваны на рабочых сходах і сходах сялянскага актыву па належнасьці.

Неабходна, каб аднаведныя савецкія органы ў сваіх адносінах на імя курсаў далі поўныя весткі аб сацыяльнамаемасным становішчы, мінулай і сучаснай грамадзкай і савецкай працы, і сваю думку, на якую працу мяркуецца паслаць пасьля сканчэньня курсаў.

Трэба, каб гэтая думка была ня толькі думкай саветаў і выканкомаў, але і самой вылучэнкі на курсы і далейшую працу, і таго актыву працоўнае масы, сярод якога кандыдатка на курсы праводзіла да гэтага часу грамадзкую працу.

Прэзыдыум ЦВК спадзяецца, што саветы і акруговыя і райённыя выканаўчыя камітэты зробяць усё магчымае з свайго боку, каб арганізуемыя пры ЦВК курсы жанчын мелі максымальныя станоўчыя вынікі.

А. ХАЦКЕВІЧ.

Да сьвята вызваленьня ад белапалякаў.

На імя старшыні ЦВК т. Чарвякова паступіла кампазіцыя марша, прысьвечанага вызваленьню Беларусі ад белапалякаў, якую напісаў працаўнік прамысловага прадпрыёмства на Барысаўшчыне т. Іваноў.

Тав. Чарвякоў даў загад накіраваць гэты марш у Белмузтэхнікум на разгляд.

Пякарня працуе, а людзі бяз хлеба.

Пятрыкоў. У гор. Пятрыкове досыць вялікая каапэрацыя, мае больш 6 крам, арцель краўцоў і інш., а ў наступны момант працуе і хлебапякарня. Гарадок мае больш 6 тысяч насельніцтва. Праўленьне спажывецкай каапэрацыі, у зьвязку з адчыненьнем хлебапякарні дало загад не прадаваць нікому мукі, а каб насельніцтва купляла печаны хлеб. Нажаль, пякарня ў дзень выпякае 15 пуд. хлеба, а насельніцтва 6 тысяч. Мукі не прадаюць і прыходзіцца сядзець бяз хлеба. Усё насельніцтва было нездаволена кіраваньнем тав. Чумака—старшыні праўленьня, і 9-У—28 г. раз'юшаныя бабы хацелі яго набіць.

Калі немагчыма задаволіць насельніцтва печаным, хебам трэба прывезьці мукі ў дастатковай меры, каб ня было недахвату яе.

В.

ПРАЦУ РАСПАЧАЛІ, ЧАКАЕМ ДАПАМОГІ АД САЮЗАЎ.

(Слуцак.)

З ліквідацыяй Слуцкай акругі было зьліквідавана і акруговае т-ва. Адраджэньнем працы па т-ву «Прэч Няпісьменнасьць» у райённым маштабе трэба лічыць з лютага бягучага году, калі адбыўся сход прадстаўнікоў розных устаноў г. Слуцку.

На гэтым сходзе было абрана праўленьне. Сход быў склікан з мэтаю арганізаваць райённа-гарадзкое т-ва, для чаго былі запрошаны і прадстаўнікі райёну, але, з прычыны іх няяўкі, удалося арганізаваць толькі гарадзкое таварыства.

За гэты тэрмін гарадзкое т-ва разгарнула сваю працу, трэба лічыць, досыць добра.

Удалося з'арганізаваць 17 ячэек з лікам сяброў 525 чал. Большасьць сяброў унесла ўступны і сяброўскія ўзносы за 3-4 м-цы, так што сабрана каля 70 руб. грошай.

На гэтыя сумы адчынены 2 лікпункты, дзе вядуць працу настаўнікі. З прычыны позьняга адчыненьня лікпунктаў, канец лютага—пачатак сакавіка, прыцягнуць вельмі значны лік слухачоў ня было магчыма.

Як вядома з практыкі мінулых гадоў, найлепшая праца на лікпунктах усюды вядзецца з пачатку навуковага году і слабее якраз у гэтыя месяцы, але ўсё-ж такі, лікпункты працуюць.

Праца па ўцягненьню насельніцтва ў сябры т-ва працягваецца, і штодня лік сяброў павялічваецца.

Калі зьвярнуцца да складу арганізацыі, дык трэба адзначыць, што на захады савету т-ва, па ўступленьні ў склад т-ва, найбольш адклікнуліся настаўнікі школ, вучні, а гэтак сама студэнты настаўніцкіх курсаў і толькі некаторыя саюзы. Праўда, і школы не аднолькава—напрыклад, І і ІІ сямігодкі зусім слаба адгукнуліся і дагэтуль далёка ня ўсе настаўнікі гэтых школ зьяўляюцца сябрамі т-ва, а ўжо каму і ня быць сябрам т-ва «Прэч Няпісьменнасьць», калі не настаўніку.

З саюзамі справа абстаіць гэтак сама ня вельмі добра—сяброў саюзу павінна-б больш быць у арганізацыі, чым ёсьць ціпер.

Праўленьням-жа саюзаў таксама трэба пайсьці насустрэч арганізацыі: ну, хаця-б у сэнсе матар'яльнай дапамогі.

Між іншым, разоў з чатыры старшыня гарсавету т-ва тав. Сярэбранікаў дагаварваўся і ўжо, нават, нібы дагаварыўся з саюзамі будаўнікоў і харчавікоў аб пяцірублёвай штомесячнай дапамозе т-ву на мэты ліквідацыі няпісьменнасьці, але калі дайшла справа, каб падпісаць умову, дык і дагэтуль над тым ці іншым «сосусам» ніяк умова не падпісваецца. Што значыць для саюзу 5 руб., тым больш, што гэтыя грошы вызначаны па каштарысу на культсправы саюзу, а сябры іх наведваюць нашы-ж лікпункты,—а для т-ва гэта грошы!

Ня варта, таварышы старшыні саюзаў, далей цягнуць гэту справу—грошы ў вас марынуюцца,—а мы на іх падручнікаў купім для лікпункту.

Але так ці іначай, працу сваю Слуцкае гарадзкое т-ва распачало, будзе працягваць, і мае надзею, што яму ўдасца зрушыць з месца некаторых таварышоў, а гэтаксама і некаторыя ўстановы і тым самым выканаць свае абавязкі.

К. Г.

АБАРОНА КРАІНЫ.

Прызыў на перападрыхтоўку начскладу запасу.

Надыходзіць пэрыяд лягернага збору, а разам з ім і чарговая перападрыхтоўка начскладу запасу. Першая чарга прыцягваецца на перападрыхтоўку пры вайсковых часьцях і ўстановах з 31-га мая тэрмінам на 45 дзён.

Асноўнай задачай перападрыхтоўкі зьяўляецца папаўненьне вайсковых ведаў начскладу запасу, якія павінны адказваць сучасным патрабаваньням кадравага камандзіра Чырвонай арміі.

Папоўніць свае вайсковыя веды для таго, каб умець добра кіраваць у баявых абставінах вайсковым злучэньнем ці часьцю, здолець выканаць свае абавязкі, якія зараз ускладніліся, таму што вайсковая справа рухаецца ўперад, зьмяняецца тэхнічнае ўзбраеньне часьцей, што для камандзіра запасу зьяўляецца галоўнай справай.

Будучая вайна з капіталістычным ворагам будзе вайной, куды будзе ўцягнута ўсё насельніцтва краіны, і таму ставіць перад грамадзкай арганізацыяй ТДА Авіяхіму задачу азнаямленьня рабочых і сялян з вайсковай справай.

Камандзір запасу павінен быць асноўным працаўніком у гэтай арганізацыі па распаўсюджваньні вайсковых ведаў сярод насельніцтва.

Апроч гэтага, гэты збор больш цесна зьвяжа начсклад запасу з Чырвонай арміяй і дасьць яму магчымасьць самастойна працаваць над вайсковай кнігай у парадку самадзейнасьці.

Да перападрыхтоўкі ў гэтым годзе прыцягваецца начсклад запасу, які не праходзіў перападрыхтоўкі наогул, так і тыя, якія праходзілі да 1925 году ўключна.

Начсклад запасу, які працуе ва ўстановах і прадпрыёмствах і павінен накіравацца на збор, на гэты час аслабаняецца ад сваіх службовых абавязкаў з захаваньнем займаемай пасады і сярэдняга заробку. Гэтым асобам вайсковыя часьці будуць выплачваць толькі розьніцу ў акладзе заробку па армейскай пасадзе.

Беспрацоўныя, сяляне якія займаюцца сельскай гаспадаркай, часовыя сэзонныя рабочыя, саматужнікі адзінкі і вучні (апошнія за вылікам стыпэндыі) здавальняюцца ў поўным разьмеры сутачнымі грашамі.

У зьвязку з гэтым, ад'яжджаючы на збор, начсклад запасу павінен мець даведку аб службе з указаньнем сярэдняга месячнага заробку, але ня месячнага акладу, аб беспрацоўі, занятках сельскай гаспадаркай, саматужным занятку, а вучні, калі яны адначасова ня служаць, аб атрымліваемай стыпэндыі, што неабходна пры вылічэньні сутачнай узнагароды. Асобы, якія ня маюць пры сабе гэтых дакумэнтаў, здавальняцца сутачнымі грашыма ня будуць.

Зараз трэба паставіць пытаньне перад усімі арганізацыямі і ўстановамі, каб начсклад, які выклікаецца, не затрымліваўся хадайніцтвамі аб немагчымасьці замяніць яго, як было ў мінулы пэрыяд. Адрыў ад працы камскладу запасу на 45 дзён ня можа зрабіць вялікай шкоды ў працы арганізацыі, бо заўсёды можна яго замяніць.

Нежаданьнем вызваліць асобу, якую заклікаюць на перападрыхтоўку, можна прынесьці больш шкоды краіне.

Пры пасылцы начскладу запасу ў гэтым годзе бярэцца цьвёрдая лінія, што начсклад будзе вызваляцца толькі па стану свайго здароўя, а іншыя хадайніцтва аб вызваленьні разглядацца ня будуць. **В. Місьнікоў.**

Яўка пераменьнікаў забясьпечыць посьпех вучобы.

Сярод кадру імя Маскоўска-Курскіх чыгунак палка падрыхтоўка да выхаду ў лягеры распачалася своечасова. У першую чаргу былі праведзены сэмінары сэкратароў ячэек КП(б)Б. Далей прыступілі да выкананьня загаду па Белдывізіі і акрузе—гэта беларусізацыя ўсяго кампалітскладу палка, бо ў гэтым годзе прыдзецца ў лягерах вучыць моладзь выключна на беларускай мове па ўсіх тых статутах, якія ўжо ёсьць на беларускай мове. Асаблівую ўвагу на беларусізацыю павінны зьвярнуць асобы малодшага камскладу, якія вывучалі статуты на расейскай мове. Затое ўжо цяперашнім курсантам палшколы будзе лёгка таму, што амаль усе прадметы і каманды з першага дню вучобы праводзяцца на беларускай мове.

Зараз праводзяцца сэмінары з апоргамі камсамольскіх груп і наладжваюцца сэмінары вайскораўскіх рэдкалегій. Наладжваюцца заняткі з сярэднім і старэйшым кампалітскладам, сэмінары палітгрупаводаў. Наогул, як і ў кожным годзе, кадр кампалітскладу палка напружана рыхтуецца да летняй працы зьвязанай з вайсковым і палітычным выхаваньнем беларускага маладняка.

Савецкія ўстановы, партыйныя, камсамольскія, прафэсыянальныя арганізацыі і камандзіры запасу павінны памятаць, што набліжаецца вельмі адказная і сур'ёзная праца. Трэба загадзя распачаць падрыхтоўку, каб не зрабіць памылак мінулага году, калі некаторыя пераменьнікі ня ведалі, што яны павінны зьявіцца на збор. **Я. Бароўскі.**

Лепш позна, чым ніколі.

(З загатоўчага бязладзьдзя).

Карабейнік—гэта чарадзей для кожнай загатоўчай арганізацыі; гэта яго дапамога выручала ў цяжкія мінуты загатовак...

Карабейнік працаваў для каапэрацыі, для Белдзяржгандлю, для Хлебапрадукту, для розных таварыстваў, а галоўнае — той-жа самы карабейнік праводзіў загатоўку ў адзін і той-жа час для 5 арганізацый. Ня будзем паўтараць тут загатоўчыя кур'ёзы, якія адбываліся з карабейнікамі,—іх арыштоўвалі, адбіралі тавар, патэнты, правы; і той, хто быў больш сільным, той выгрываў...

Зразумела, што пры такім становішчы нельга было наладзіць справу, і Наркамгандаль БССР, урэшце, калі сэзон ужо падыходзіць да канца, «узяўся за розум» і ўстанавіў цьвёрдую лінію ў адносінах да карабейнікаў.

Згодна гэтага, карабейнікі маюць права весьці загатоўкі выключна дзяржаўных тавараў, і, галоўнае, карабейнікі маюць права працаваць толькі для аднэй арганізацыі. Гэтая рашучая пастанова Наркамгандлю, акая вышла з вялікім спазьненьнем, усё-ж такі спыніць карабейную «руплівасьць» некаторых загатоўцаў і прымусіць іх узяцца за справу сваімі сіламі, сваім апаратам.

Такіх тавараў, як пушніна, лён, пянька, хлебафураж, шчаціна, скурсыравіна, не павінны загатаўляць карабейнікі; гэта спыніць тое бязладзьдзе і пераплаты, якія заўсёды былі пры загатоўцы даных тавараў карабейнікамі.

Позна вышла гэтая пастанова. Але што-ж? Мы ўжо прызвычаіліся гаварыць—«вучымся на памылках» і скажам: «лепш позна, чым ніколі»...**Л. М.**

Праца ў лягерах—экзамен для вайскора.

У № стралковым імя рабочых і служачых Маскоўска-Курскіх чыгунак палку вайскораўская праца заняла належнае месца.

Так, з новага году па 1-е мая выпушчана 5 сьветавых палкавых газэт, 5 вусных, адна юбілейная насьценная газэта, прыстасованая к дню 10-цігодзьдзя Чырвонай арміі і адна шматтыражная к 1-му мая ў ліку 130 экзэмпляраў, якія былі распаўсюджаны па раёнах камплектаваньня палка.

У кожным падразьдзяленьні палка ёсьць ільлічоўкі-насьценныя газэты, якія час ад часу абнаўляюцца.

Усяго вайскораў у палку налічваецца 124 чал. З іх партыйцаў—28, камсамольцаў—56 чал. і беспартыйных—40. З іх чырвонаармейцаў—40 чалавек, малодшага камскладу—52 ч., сярэдняга кампалітскладу—23 і старэйшага—1 чал. Пішучых у друкаваныя газэты—24 вайскоры. За гэты пэрыяд было зьмешчана 120 заметак, якія былі накіраваны імі ў розныя газэты.

На першым месцы—„Чырвонаармейская Праўда», на другім—«Савецкая Беларусь», на трэцім—«Беларуская Вёска».

Нашы недахопы: мала ўцягнута ў вайскораўскую працу чырвонаармейскага маладняку, амаль зусім ня пішуць вайскоры пераменьнікі. З прыходам пераменьнікаў склад вайскораў за лік чырвонаармейцаў значна павялічыцца.

Полк па дасылцы допісаў, ня гледзячы на тое, што зьяўляецца тэрытарыяльным, за зімовы пэрыяд заняў другое месца ў Вайсковай Беларускай Акрузе.

З прыходам у лягеры маладняку 1905 году, залічаных у пераменны склад і пазавайсковае навучаньне, сярод якіх будуць сотні рабкораў і селькораў, апошнія зараз-жа будуць ахоплены вайскораўскімі гурткамі.

Высьвятленьне лягернага жыцьця і вайсковай вучобы як праз ільлічоўкі, так і праз друкаваныя газэты значна павялічыцца. **Вайскор-арганізатар.**

Вучоба ў лягерах на беларускай мове.

У хуткім часе пачынаецца збор пераменьнікаў 1905 г. нараджэньня. Вучоба з пераменьнікамі ў гэтым годзе будзе праводзіцца выключна на беларускай мове. Справа нялёгкая. Пераменьнікі, будучы дапрызыўнікамі, вывучалі вайсковую справу на расейскай мове. Камандны склад у большасьці таксама прапрацоўваў вайсковыя пытаньні на расейскай мове.

Каб не паслабіць вайсковай вучобы з пераменьнікамі ў час збораў, перад камандаваньнем палка і партыйнай арганізацыяй паўстае пытаньне—у першую чаргу правесьці стала беларусізацыю сярод партыйцаў.

Па ротах у ячэйках УсеКП(б) ставіліся практычныя пытаньні ў галіне беларусізацыі партыйцаў.

Трэба адзначыць адзін кепскі бок, гэта тое, што ў большасьці гэтыя пастановы парт'ячэек ня выконваюцца. Напрыклад, ячэйка вынесла пастанову аб тым, каб партыйцы ў сваёй штодзённай гутарцы ўжывалі беларускую мову. А на справе—наадварот, ня толькі ў штодзённай гутарцы ня ўжываецца беларуская мова, але і на сходах ня ўсе партыйцы выказваюць свае думкі на беларускай мове.

На гэты бок партарганізацыі патрэбна зьвярнуць увагу. **М. Процька.**

г. Чэрвень, № стралк. полк.

3-ці Ўсебеларускі Зьезд інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў.

(Вячэрняе пасяджэньне 19 мая).

— За час ад апошняга зьезду,—кажа т. Каплан, мы маем значныя зьмены як у структуры, так і ў складзе інж.-тэхн. сэкцыі: з 1556 чалавек наша сэкцыя вырасла да 3500 чал.

Далей т. Каплан коратка абмаляваў разьвіцьцё нашага будаўніцтва за апошнія 2 гады, а таксама зазначыў на задачы, якія стаяць перад усёй сэкцыяй у цэлым і абвяшчае зьезд адчыненым.

Абіраецца прэзыдыум з 9 асоб, у які ўвайшлі т. т. Каплан, Ісаеў, Карп і інш.; абраны таксама сакратарыят, мандатная камісія і пад воплескі ўсёй залі ў прэзыдум абіраюцца **Старшыня ЦВК БССР тав. Галадзед і Старшыня Дзяржпляну тав. Карклін.**

Зацьвярджаецца парадак дню, рэглямант, пасьля чаго з вялікай увагай зьезд заслухоўвае прывітаньне Старшыні СНК БССР тав. Галадзеда.

У гэты-ж вечар зьезд прыступіў да працы. Першым заслухоўваецца справаздача Беларускага Міжсаюзнага Бюро інжынэраў і тэхнікаў.

Зараз інжынэрна-тэхнічная сэкцыя ў сваім складзе мае 3500 чал., якія аб'ядноўваюцца 14 сэкцыямі. Рост членаў ішоў як за рахунак узбуйненьня БССР, так і дзякуючы больш поўнаму ахопу сэкцыямі інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў. Па адукацыі з агульнага ліку—23,3 проц. з вышэйшай асьветай, 45,5 проц. з сярэдняй і 31,2 проц.—практыкі.

Досыць вялікае месца ў працы Беларускага Міжсаюзнага Бюро займалі тарыфна-бытавыя пытаньні. Бел. МБІТ прыняла вельмі актыўны ўдзел у працы камісіі па паляпшэньню быту спэцыялістаў. У выніку ў бюджэце 1927-28 г. ёсьць асыгнаваньне ў 39.000 руб. на палепшаньне становішча спэцыялістаў сельскай і лясной гаспадаркі.

Трэба адзначыць, што ёсьць некаторыя дасягненьні і ў пытаньнях аплаты працы спэцыялістаў,—удалося значна палепшыць умовы аплаты аграномаў. Наогул, сярэдняя месячная стаўка па асобных спэцыяльнасьцях хістаецца ад 85 да 212 руб.

Прымала Бел. МБІТ удзел і ў прапрацоўцы плянавых пытаньняў: дадзена заключэньне аб 5-гадовым пляне будаўніцтва жылсаюзу, па палажэньні аб мясцовых фінансах, па праэкту правіл крэдытаваньня млыноў і інш. Сэкцыі саюзаў таксама ўдзелялі ўвагу плянавым пытаньням,—к прыкладу, сэкцыю дрэваапрацовачнікаў прапрацавала заключэньне па праэкту пераабсталяваньня прадпрыёмстваў Лесбелу ў Мазыры і шэраг іншых.

У вытворчых і эканамічных нарадах і камісіях па прадпрыёмствах інж.-тэхн. працаўнікі пачалі прымаць актыўны ўдзел. Лясная сэкцыя адзначае, што за год у сярэднім на 1 лясьніцтва прыходзіцца па 3 вытворчых нарады. Сэкцыі мэталістаў, аграномаў, земляўпарадкавацеляў, чыгуначнікаў і іншыя таксама адзначаюць на рэгулярны ўдзел у вытворчых камісіях і нарадах сяброў сэкцый.

Тав. Каплан у сваім дакладзе абмаляваў дасягненьні і недахопы ва ўсіх галінах працы інжынэрна-тэхнічных сэкцый як у цэнтры, так і на мясцох.

Наогул, трэба адзначыць, што за апошнія 2 гады ў працы інжынэрна-тэхнічных сэкцый Беларусі вызначыўся поўны зьдзьвіг у бок больш правільнай арганізацыі работы і больш поўнага ўцягненьня сэкцый і паасобных інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў у агульна-саюзную работу.

У заключэньне тав. Каплан указаў на тыя вялікія задачы, якія стаяць перад інж.-тэхн. працаўнікамі ўсяго Саюзу і ў прыватнасьці БССР.

Тэлеграма.

Масква, Вярхоўны Суд, грамадзкаму абвінаваўцу Шэйну.

3-ці Ўсебеларускі зьезд інжынэраў і тэхнікаў выказвае сваё глыбокае абурэньне супроць дзейнасьці групы інжынэраў і тэхнікаў, працаваўшых у Данбасе на карысьць замежнага капіталу і контр-рэвалюцыі.

Зьезд патрабуе суровай кары здраднікам сацыялістычнага будаўніцтва.

ПРЭЗЫДЫУМ ЗЬЕЗДУ.

У ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦВК БССР.

17-га мая г. г. пад старшынствам тав. **А. Г. Чарвякова** адбылося чарговае пасяджэньне прэзыдыуму ЦВК. Разам з іншымі пытаньнямі разгледжаны наступныя:

Даклад аб перасяленьні яўрэяў у Біра-Біджанскі раён.

Прэзыдыум ЦВК заслухаў даклад **Белкамзэту** аб перасяленьні яўрэяў у Бірска-Біджанскі раён.

29-га красавіка 1928 г. Саюзным Урадам было пастаноўлена прадставіць Біра-Біджанскі раён на Далёкім Усходзе для засяленьня працоўнымі яўрэямі. Да вынясеньня гэтае пастановы на месца была паслана навуковая экспэдыцыя, якая ў выніках усебаковага аналізу Біра-Біджанскага раёну прышла да вываду, што гэтая мясцовасьць зьяўляецца найбольш спагаднай для засяленьня яўрэямі. Біра-Біджанскі раён налічвае плошчу ў 2.500.000 гэктараў зямлі. На першы час магчыма засяліць каля 10.000 сем'яў на ўжыткоўных землях; астатнія-ж землі прыдзецца прывесьці ў прыгоднае для вядзеньня сельскае гаспадаркі становішча—шляхам мэліарацыі і іншых агры-культурных мерапрыёмстваў.

Камзэт СССР прыняў рашэньне прыступіць да перасяленьня ў 1928 году. Усяго ў гэтым годзе намяркована перасяліць 500 сем'яў, з якіх з БССР 180 сем'яў і 60 чалавек адзіночак. Наогул з БССР падлягала перасяленьню 240 чалавек-хадакоў у 2 тэрміны: палова —у сярэдзіне красавіка і другая палова ў пачатку мая. Белкамзэт пакаваны нарад выканаў на 100 проц., пры гэтым з БССР фактычна пераселена нават больш 240 чалавек. Белкамзэт на першы час меў шэраг цяжкасьцяй: яўрэйскае насельніцтва яшчэ хісталася адносна перасяленьня ў гэтую далёкую, мала ёй вядомую, мясцовасьць. Але дзякуючы праведзенай асьветнай рабоце, гэты страх перад новай мясцовасьцю амаль што прайшоў. Па асобных акругах перасяленьне ілюструецца наступнымі данымі:

З Менскай акругі пераселена 85 чалавек, Віцебскай—19, Гомельскай—27, Бабруйскай—50, Магілеўскай—37, Аршанскай—19, Менскай—92.

Трэба адзначыць, што імкненьне яўрэйскага насельніцтва да перасяленьня вялікае і паказаныя лічбы не задаволілі ўсіх заявак на перасяленьне.

Адлегласьць Біра-Біджанскага раёну да Масквы складае каля 9.000 кілёмэтраў. Згодна маючыхся зьвестак, перасяленцы ўжо прыбылі на месца, дарога ў сярэднім працягвалася ад 21 да 24 дзён.

Па свайму сацыяльнаму становішчу перасяленцы састаяць, галоўным чынам, з саматужнікаў, беспрацоўных некваліфікаваных рабочых, быўшых дробных гандляроў і наогул складаюць бядняцкую частку насельніцтва. Перад Белкамзэт'ам у сучасны момант стаіць задача—забясьпечаньне хоць-бы ў некаторай меры застаўшыяся часова ў межах БССР сем'і перасяленцаў.

Навокал дакладу разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. У спрэчках выказаліся т. т. **Ігнатоўскі, Хацкевіч, Рачыцкі, Ашаровіч, Бэйлін, Чарвякоў.**

Прэзыдыум ЦВК па дакладу паставіў:

Маючы на ўвазе вялікую цягу яўрэяў да вытворчай працы і немагчымасьць поўнага задавальненьня зямлёй у старых мясцох насяленьня, лічыць, што пастанова ЦВК Саюзу ССР аб перадачы Бірска-Біджанскага раёну Дальняга Усходу для земляўпарадкаваньня яўрэяў вынесена своечасова і будзе садзейнічаць вырашэньню гэтых задач, а таксама дае магчымасьць утварыць у далейшым аўтаномную савецкую яўрэйскую адзінку.

Прэзыдыум ЦВК даручыў усім савецкім органам БССР аказваць падтрыманьне ў правядзеньні гэтае працы. Разам з гэтым Прэзыдыум ЦВК прапанаваў усім савецкім органам, асабліва Белкамзэту і Наркамзему праводзіць і надалей неаслабным тэмпам мерапрыёмствы па землянадзяленьні працоўных яўрэяў у БССР, прымаючы асаблівыя меры да каналізацыі балотных масываў.

Аб правядзеньні нацпалітыкі ў Бабруйскай акрузе.

Прэзыдыум ЦВК прыняў пастанову па дакладу Бабруйскага Акрвыканкому (які быў заслухан на папярэднім пасяджэньні Прэзыдыуму ЦВК) аб правядзеньні нацпалітыкі ў Бабруйскай акр. Прэзыдыум ЦВК адзначыў, што вынікі працы па правядзеньні беларусізацыі і тэмп яе па акрузе зьяўляюцца нездавальняючымі, асабліва ў гарадох Бабруйску і Жлобіне. У мэтах ўзмацненьня працы па беларусізацыі савецкіх і грамадзкіх устаноў, а таксама ў мэтах большага разьвіцьця працы сярод нацменшасьцяй, Прэзыдыум ЦВК даручыў Бабруйскаму АВК правесьці ў жыцьцё шэраг мерапрыёмстваў, паміж іншым:

а) неадкладна прыняць рашучыя меры да поўнага правядзеньня беларусізацыі ва ўсёй акрузе; б) прыняць рашучыя меры па вывучэньні і ўжываньні супрацоўнікамі ўстаноў беларускае мовы; в) павесьці рашучую барацьбу з астаткамі фармальных адносін да беларусізацыі; г) прыняць крокі для большага прасоўваньня ў раёны акругі масавай літаратуры і газэт на беларускай мове; д) узмацніць работу па пераводу на белмову заняткаў сярод дапрызыўнікаў, а таксама і пазашкольнай работы сярод беларусоў у вайсковых частках; е) узмацніць працу нацыянальных саветаў, арганізаваўшы навакол іх актыў з батракоў і беднаты.

У мэтах палепшаньня культурна-асьветнага абслугоўваньня працоўнага насельніцтва Бабруйшчыны, Наркамасьветы даручана ў бліжэйшы час накіраваць у Бабруйскую акругу беларускі дзяржаўны тэатр.

Нацкамісіі ЦВК даручана, у мэтах паскарэньня тэмпу правядзеньня беларусізацыі, заслухаць у бліжэйшы час плян працы Бабруйскай Акруговай Нацыянальнай Камісіі.

Пра зьмену арт. 27 „Палажэньня аб лясох мясцовага значэньня і аб вядзеньні гаспадаркі ў іх“.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў закон пра зьмену артыкулу 27 «Палажэньня аб лясох мясцовага значэньня і аб вядзеньні гаспадаркі ў іх». Згодна новай рэдакцыі арт. 27 Палажэньня, канфіскаваны пры лесапарушэньнях у лясох мясцовага значэньня лес, а таксама карнявая каштоўнасьць перадаюцца ў даход дзяржаўнага бюджэту, а штрафныя сумы, накладзеныя ў адміністрацыйным парадку за лесапарушэньні, ідуць у даход мясцовага бюджэту.

Пра зьмену і дапаўненьне Зямельнага Кодэксу БССР.

Прэзыдыум ЦВК, у выкананьне пастановы VIII Усебеларускага Зьезду Саветаў аб спрашчэньні земляўпарадчага працэсу, як з тэхнічнага, гэтак і з юрыдычнага боку, зацьвердзіў закон пра зьмену і дапаўненьне Зямельнага Кодэксу БССР. Новы закон значна спрашчае земляўпарадчы працэс.

Пра парадак выданьня акруговымі і раённымі выканаўчымі камітэтамі і гарадзкімі саветамі абавязковых пастаноў і пра накладаньне пакараньняў за іх парушэньне.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў закон пра парадак выданьня акруговымі і раённымі выканаўчымі камітэтамі і гарадзкімі саветамі абавязковых пастаноў і пра накладаньне адміністрацыйных пакараньняў за іх парушэньне.

У гэтым законе дасканала вызначаны тыя правы, якія маюць выканкомы і гарсаветы ў справе выданьня абавязковых пастаноў, а таксама і накладаньня пакараньняў за іх парушэньне. Гарадзкім саветам акруговых гарадоў у паказанай галіне дадзены аднальковыя правы з акрвыканкомамі, а гарадзкім саветам неакруговых гарадоў аднолькавыя правы з райвыканкомамі.

Аб масавай рабоце гарадзкіх саветаў.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў цыркуляр да ўсіх выканаўчых камітэтаў і гарадзкіх саветаў аб мерах да ўзмацненьня і палепшаньня работы гарадзкіх саветаў.

Гэты цыркуляр пасылаецца мясцом у тэрміновым парадку.

Наркам РСІ даручана прасачыць за перадачай выканаўчымі камітэтамі гарадзкім саветам гарадзкіх прадпрыемстваў і маёмасьці, у мэтах замацаваньня за гарсаветамі ролі самастойнае гаспадарчае адзінкі.

ВЫДАВЕЦКІЯ ПЛЯНЫ І ПАТРЭБЫ ЖЫЦЬЦЯ.

I.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва распачало складаньне пяцігадовага пэрспэкцыйнага выдавецкага пляну. Праца гэта каштоўная і цікавая ня толькі для БДВ і ўстаноў, якія непасрэдна ім кіруюць. Беларуская савецкая грамадзкасьць павінна быць зацікаўлена ў гэтым пытаньні ня менш самога БДВ. Таму асьвятленьне ў друку шэрагу пытаньняў, зьвязаных са складаньнем пэрспэкцыйнага пляну, зараз надзвычайна неабходна. Пры належным абмеркаваньні можна будзе больш поўна ўлічыць недахваты выдавецкай справы і выявіць задачы, якія стаяць перад намі ў галіне выданьня кніг.

Сёлетні год трэба лічыць пераломным у працы БДВ.

Першы пэрыяд выдавецкай дзейнасьці на Беларусі ахапляе час, які можна лічыць арганізацыйным. Ён працягваецца да 1924 году, калі пасьля аб'яднаньня выдавецтваў „Савецкая Беларусь“ і «Белтрэстдрук» было створана БДВ.

Другі пэрыяд—гэта дзейнасьць БДВ спачатку яго арганізацыі па сёлетні год. Ён характарызуецца плянавасьцю як у выдавецкай справе, так і ў распаўсюджваньні кніжкі. Выдавецкая справа пераважна, з пачатку арганізацыі БДВ, згрупавалася ў адным месцы і гэта ў некаторым сэнсе мела свае добрыя вынікі ў параўнаньні з ранейшым часам.

На працягу апошніх 5 год Выдавецтва садзейнічала вырашэньню тых задач, якія стаялі перад намі ў галіне культурнага будаўніцтва. Галоўнымі з іх былі: **стварэньне беларускай школы, разьвіцьцё беларускай мастацкай літаратуры, палітычнае выхаваньне шырокіх колаў рабочых і сялян.** Усе гэтыя задачы былі надзвычайна важнымі і ня зусім лёгкімі. Да Кастрычніка мы ня мелі беларускай школы, а беларуская літаратура ня мела ніякіх умоў для свайго разьвіцьця. Слабасьць і распыленасьць рабочае клясы, адсутнасьць глыбокага рабочага руху вымагалі асаблівай напружанасьці сіл, каб у справе палітычнага выхаваньня мас мець належныя посьпехі.

Ва ўсіх гэтых задачах роля друкаванага слова—кніжкі—набывала вялізнае значэньне. Ня маючы ніякага ранейшага вопыту, трэ' было стварыць беларускія падручнікі. Інакш пытаньне аб беларускай школе магло застацца толькі разважаньнем, нікога да нічога не абавязваючым. І можна сказаць, у меру матар'яльных сродкаў БДВ гэту задачу выконвала.

Ня дрэнна ідзе справа і з выданьнем беларускай мастацкай літаратуры. Крыху горш абстаіць справа з выданьнем масавай літаратуры для сялян і палітычнай. Калі ў справе слабага выданьня сялянскай літаратуры ёсьць віна БДВ, то ў справе слабога выданьня палітычнай літаратуры, як кажуць, вінаваты «независящие обстоятельства».

Лічбы за апошнія 2 гады лепш усяго гавораць за тое, у якіх галінах БДВ мае посьпехі, а ў якіх адстае.

Посьпехі БДВ, не бяручы лічбаў выданьняў на мовах нацменшасьцяў, больш усяго вызначаюцца ў выданьні падручнікаў, мастацкай літаратуры, сялянскай, ленінскай і дзіцячай (тры апошніх галіны толькі ў сёлетнім годзе).

Іншыя галіны, як літаратура па сельскай гаспадарцы, перакладная мастацкая літаратура з замежных моваў, навуковая літаратура,—гэтыя галіны ня маюць належнага разьвіцьця ў працы БДВ.

II.

Новы пэрыяд дзейнасьці БДВ пачынаецца з пабудовай пяцігадовага пэрспэкцыйнага пляну. Таму, нам здаецца, будзе правільным, калі мы выкажам пажаданьне, каб у пяцігадовым пляне атрымалі далейшае разьвіцьцё тыя галіны, у якіх БДВ пасьпяхова працавала і былі ўлічаны запатрабаваньні, што да гэтага часу ў нашых выданьнях абміналіся.

Рост народнай гаспадаркі і тыя задачы, якія вынікаюць на падставе гэтага росту—абумоўліваюць далейшую працу БДВ.

Індустрыялізацыя, рэканструкцыя прамысловасьці на новай тэхнічнай базе, перабудова сельскай гаспадаркі (калектывізацыя) прымушаюць БДВ праводзіць сваю працу адпаведна з гэтымі галоўнымі задачамі. Праца БДВ набывае яшчэ большае значэньне ў сувязі з ажыцьцяўленьнем лёзунгу культурнай рэвалюцыі.

Мы павінны як мага хутчэй ліквідаваць няпісьменнасьць. У краіне, дзе 59 проц. няпісьменных, больш як выразна стаіць задача ліквідацыі няпісьменнасьці.

БДВ павінна ўлічыць у сваім пэрспэкцыйным пляне неабходнасьць ліквідацыі няпісьменнасьці і абслугоўваньне кнігай ліквідаваўшых няпісьменнасьць у першую чаргу.

Працэс будаўніцтва беларускай школы толькі разгортваецца.

Школа павінна з кожным годам расьці ўсё больш і больш.

Адгэтуль справа выданьня падручнікаў на падставе вопыту мінулага—ёсьць актуальнейшая справа. Для першага канцэнтру сямігодкі мы маем падручнікі, для старэйшых груп сямігодкі падручнікаў яшчэ не хапае. Мала падручнікаў на беларускай мове і для розных відаў тэхнікумаў. Беларусізацыя Вузаў па крысе ідзе наперад. Усё гэта ставіць у абавязак БДВ даць на працягу наступных пяці гадоў падручнікі як для пачатковых школ і тэхнікумаў, так і для Вузаў. Інакш справа будаўніцтва як ніжэйшай, так сярэдняй і вышэйшай школы будзе кульгаць. А наконт беларусізацыі Вузаў няма чаго і гаварыць. Бо нельга ісьці наперад у справе беларусізацыі, калі ўсе падручнікі не на беларускай мове. Пры гэткіх умовах увесьці ў быт студэнцтва родную мову вельмі цяжка.

Разьвіцьцё беларускай мастацкай літаратуры застаецца нязьменнай задачай вялікай важнасьці. Калі зараз мы можам раіць чытачу беларускую мастацкую кніжку—гэта дасягненьне. Але гэтага мала. Кадры культурнай моладзі шпарка растуць, патрабаваньне на літаратуру на роднай мове з кожным годам павялічваецца. Выбар беларускай мастацкай кніжкі, аднак, абмежаваны. Таму, друкуючы ўсё, што ёсьць каштоўнага з беларускай мастацкай літаратуры—мы павінны хутчэй распачаць выданьне мастацкіх твораў з іншых моваў у перакладзе на беларускую. У першую чаргу лепшых пралетарскіх твораў з расейскай і украінскай мовы. У другую чаргу—клясыкаў з усіх моваў.

Магчыма будуць погляды, што беларусам можна карыстацца мастацкай літаратурай на расейскай мове. Такія погляды, аднак, зусім памылковыя. Калі гэта крыху правільна да старэйшых пакаленьняў, дык зусім няверна ў адносінах да маладзейшых. А што карыстацца толькі беларускай мастацкай л і т а р а т у р а й немажліва, лепшым доказам можа служыць размах у выданьні замежнай мастацкай літаратуры на расейскай мове. Пры ўсім багацьці расейскай літаратуры (як старай, так і новай) выдавецтва РСФСР і іншыя абагачаюць кніжны рынак тысячамі назваў замежных мастакоў слова. Праўда, сярод гэтых выданьняў шмат непатрэбных, часамі нават шкодных. Але, выкарыстаўшы вопыт расейскіх выдавецтваў, мы такіх памылак лёгка пазбавімся.

Усе закранутыя моманты дакраналіся, галоўным чынам, тых галін, у якіх беларуская кніжка зрабіла некаторыя посьпехі.

Новы пэрыяд больш складаны, чым ранейшы. Абумоўлены пэўнымі гаспадарчымі задачамі, ён вымагае ад БДВ большае шырыні яго выдавецкіх праграм. Паўстае пытаньне аб выданьні літаратуры, зьвязанай з разнастайнымі галінамі народнай гаспадаркі. Лёзунг культурнай рэвалюцыі абавязвае БДВ больш шырока адгукнуцца на запатрабаваньні рабочых і сялянскіх гушчаў. Паглыбленьне палітычнага выхаваньня мас і беларусізацыі партыйных і камсамольскіх арганізацый, як ніколі высоўвае пытаньне аб палітычнай літаратуры на беларускай мове. З гэтымі задачамі аднаму БДВ будзе цяжка справіцца. Рацыянальны падзел працы паміж БДВ і іншымі выдавецтвамі, бязумоўна, неабходны.

III.

Акрамя БДВ на Беларусі ёсьць яшчэ некалькі выдавецтваў. У большасьці гэта ведамсьцьвенныя выдавецтвы. Найбольш патрэбным з апошніх трэба лічыць выдавецтва Наркамзему.

На вялікі жаль, гэта выдавецтва існуе больш юрыдычна, чым фактычна. У ранейшых артыкулах нам даводзілася падкрэсьліваць, што становішча выдавецтва Наркамзему варта жалю. А між тым, у нашых варунках, у краіне, дзе сельская гаспадарка пакуль пераважае, такое выдавецтва павінна было-б стаць на пэўнай вышыні.

У РСФСР, дзе выдавецтваў як дзяржаўных, так і прыватных налічваецца некалькі дзесяткаў, выдавецтва Наркамзему «Новая Деревня» на кніжным рынку займае пэўнае сталае месца. Падобнае выдавецтва ва ўмовах Беларусі павінна набыць яшчэ большую вагу. Зараз, пры складаньні пяцігадовага пляну, зусім дарэчы паставіць пытаньне аб тым, каб выдавецтва Наркамзему БССР існавала ня толькі на паперы, але і прыступіла да выкананьня задач, якія перад імі стаяць.

Існаваньне і пашырэньне працы выдавецтва Наркамзему патрэбна па наступнай прычыне. БДВ ня можа справіцца з абслугоўваньнем кніжкай у розных галінах сельскай і лясной гаспадаркі. Выдавецтва Наркамзему, якое кіруе разьвіцьцём сельскай гаспадаркі, можа зрабіць гэта з посьпехам. Яно хутчэй улічыць запатрабаваньні сялянства на спэцыяльную літаратуру, згрупуе вакол сябе патрэбных спэцыялістаў-аўтараў праз працаўнікоў Наркамзему на пэрыфэрыі хутчэй прасуне кніжку да сялянства. БДВ таксама павінна выдаваць спэцыяльную літаратуру ў розных галінах народнай гаспадаркі, але ў справе сельскай і лясной гаспадаркі яно можа толькі дапаўняць працу выдавецтва Наркамзему. Усе гэтыя моманты трэба прыняць пад увагу, складаючы пяцігадовы выдавецкі плян. **Выдавецтва Наркамзему павінна існаваць, належным чынам фінансавацца, павінна мець свае сталыя выдавецкія пляны.** Апошнія павінны быць узгоднены з плянам БДВ, каб ня было часамі лішняй роўналежнасьці. Калі ня будуць гэтыя м е р а п р ы ё м с т в ы праведзены ў жыцьцё, мы і ў наступныя гады будзем мець выпадкі, што праца нашых выдавецтваў ня будзе адпавядаць актуальным гаспадарчым задачам.

IV.

Звычайна выдавецкія пляны БДВ распрацоўваліся выдавецтвам і зацьвярджаліся Наркамасьветы. Практыка на працягу апошніх пяці гадоў гаворыць за тое, што поўнага ўлічэньня запатрабаваньняў розных галін культуры і гаспадаркі ў гэтых плянах ня было. Вынікам такога становішча было тое, што БДВ ня выконвала часамі такіх элемэнтарных абавязкаў, якія, нават пры яго абмежаваных матар'яльных сродках, магло выканаць. Прыкладам можа служыць адсутнасьць літаратуры пра калектывізацыю ці мэліарацыю. Колькі месяцаў пасьля апошняга партзьезду гутарым пра калектывізацыю, будуем калектывы, а вось кніжкі ніяк ня можам выдаць. Ды ня толькі кніжкі, а нават статутаў арцеляў і камун няма. Такіх прыкладаў можна прывесьці сотні. Яны гавораць аб тым, што сыстэму пабудовы выдавецкіх плянаў трэба неяк зьмяніць.

Наркамасьветы можа добра ўлічыць патрэбу ў падручніках, папулярнай палітычнай літаратуры, мастацкай літаратуры. Але ўлічыць запатрабаваньні ў літаратуры па гаспадарчых пытаньнях—яму будзе цяжэй. Таму **неабходна, каб пры пабудове выдавецкіх плянаў БДВ мела ў сябе заяўкі ад усіх Наркаматаў і ўстаноў, зацікаўленых у выданьні пэўнай літаратуры.** Плян пабудовы на падставе такіх заявак будзе больш грунтоўным, больш адпавядаць жыцьцю.

V.

У гэтым артыкуле мы ня ставілі сваёй мэтай ахапіць усе пытаньні, зьвязаныя з пабудовай выдавецкага пляну. Мы мелі на мэце даць найбольш важныя, па нашай думцы, заўвагі. Яны складаюцца сьцісла з наступнага:

1) У справе пабудовы пяцігадовага выдавецкага пляну павінны быць зацікаўлены ня толькі БДВ і Наркамасьветы, але ўсе кіруючыя ўстановы і арганізацыі, а таксама савецкая грамадзкасьць.

2) Будуючы пяцігадовы выдавецкі плян неабходна ўлічыць як патрэбы асьветы, разьвіцьця беларускай літаратуры, так і асаблівa патрэбы ў кніжцы па розных галінах гаспадаркі.

3) Лёзунг культурнай рэвалюцыі мусіць знайсьці ў выдавецкім пляне шырокае ажыцьцяўленьне.

4) Задачы стварэньня вышэйшых форм культуры і задачы абслугоўваньня шырокіх рабочых і сялянскіх мас павінны знайсьці гармавічнае злучэньне.

5) У мэтах больш поўнага абслугоўваньня кнігай патрэб сельскай гаспадаркі—разгарнуць працу выдавецтва Наркамзему, адпусьціўшы апошняму патрэбныя сродкі. Выдавецкі плян Наркамзему ўзгадніць з выдавецкім плянам БДВ, у мэтах зьнішчэньня раўналежнасьці ў працы і больш карыснага разьмеркаваньня працы.

6) Усе зацікаўленыя ўстановы і арганізацыі павінны даць БДВ свае заяўкі на пэўную колькасьць друкаваных аркушаў, па пытаньнях, якія іх цікавяць. Гэта дасьць магчымасьць больш поўна ўлічыць патрэбы ў друкаваным слове па асобных галінах як культурнага, так і гаспадарчага будаўніцтва.

АЛЕСЬ АДАМОВІЧ.

Ад рэдакцыі:

Друкуючы артыкул т. Адамовіча, рэдакцыя зьвяртаецца да ўсіх зацікаўленых устаноў і асоб выказацца на старонках газэты па закранутых пытаньнях.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Постанова СНК БССС

пра ахову лясоў.

Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Забараніць у дзяржаўных лясох без належнага пісьмовага дазволу:

а) высякаць лес наогул і ў паасобку ня ў тым месцы, якое вызначана ў лесасечным білеце;

б) вывозіць з лесу буралом і валежнік;

в) зьдзіраць бярэсту, лыка, луб і дубільную кару;

г) гнаць смалу, дзёгаць, выпальваць вугаль;

д) праводзіць дарогі, скарыстоўваць лясную плошчу для складаў;

е) ставіць вульлі, касіць сена і д. т. п.

Увага 1. Для зьбіраньня ў дзяржаўных лясох грыбоў, ягад, моху, лісьця, лясное падсьцілкі, а таксама дрэўнага насеньня для лесакультурнае працы пісьмовага дазволу лясьнічага ня трэба.

Увага 2. Лясьнічыя могуць дазволіць падбіраць у дзяржаўных лясох гальлё і сукі.

2. Забараніць у дзяржаўных лясох:

а) ламаць дрэвы і псаваць іх насечкамі, падсечкамі і інш.;

б) зьнішчаць, псаваць і пераносіць капцы, якія вызначаюць межы кварталаў, лесасек і інш.;

в) раскладаць агонь у час з 1-га мая да 1-га кастрычніка.

3. Калі драўніна, атрыманая з лясоў дзяржаўнага альбо мясцовага значэньня для скарыстаньня на свае патрэбы ў натуры, будзе прададзена без дазволу, то з вінаватага спаганяецца праз суд розьніца паміж тэй сумай, якую ён заплаціў за лес, і таксамай каштоўнасьцю з гандлёвай наддачай.

Калі драўніна затрымана да продажу, то яна адбіраецца і паступае ў распараджэньне адпаведнага зямельнага органу.

Калі-ж суд выявіць, што, атрымоўваючы драўніну нібы для скарыстаньня на свае патрэбы ў натуры, вінаваты меў на мэце прадаць яе, то вінаваты, апроч таго, прыцягваецца да адказнасьці паводле артыкулу 187 Крымінальнага Кодэксу.

Асоба, якая купляе драўніну, ведаючы, што яна атрымана прадаўцом для скарыстаньня на свае патрэбы ў натуры, прыцягваецца да адказнасьці паводле артыкулу 139 Крымінальнага Кодэксу, прычым купленая драўніна ад яго адбіраецца і паступае ў распараджэньне адпаведнага зямельнага органу.

Увага. Драўніна, незаконна здабытая ва ўсіх выпадках, адбіраецца і паступае ў даход дзяржавы, а вінаватыя прыцягваецца да адказнасьці паводле артыкулу 99 Крымінальнага Кодэксу.

4. Продаж драўніны дазваляецца, калі ў дакуманце, на падставе якога яна набыта, паказана, што драўніна куплена з таргоў на агульных падставах з дазволам на продаж альбо прызначана для механічнай ці хэмічнай перапрацоўкі саматужна-прамысловаю каапэрацыяй ці паасобнымі саматужнікамі.

5. Пасьба жывёлы ў дзяржаўных лясох дазваляецца паводле дагавору мясцовага насельніцтва з лясьніцтвам на падставе спэцыяльнага білету.

6. Забараняецца пасьвіць жывёлу:

а) на плошчах лясных рассаднікаў і плянтацый;

б) на дзялянках, на якіх пасеяны ці пасаджаны лес;

в) на лесасеках, палянках і прагалінах, прызначаных для натуральнага аднаўленьня лесу;

г) на выпаленых мясцох;

д) у маладняках;

е) на дзялянках, прызначаных для паступовых насенна-лесасечных высечак;

ж) у заказьніках і ў лясох, што зьяўляюцца помнікамі прыроды;

з) на плошчах задзярнелых альбо паўзадзярнелых пяскоў.

7. Калі паказаныя ў артыкуле 6 плошчы знаходзяцца сярод месц пасьбы альбо граніцаць з імі, то лясьніцтва заключае дагавор на пасьбу толькі пасьля таго, як уласьнікі жывёлы паводле паказаньняў і пад наглядам лясной адміністрацыі і варты загародзяць гэтыя плошчы альбо заплацяць лясьніцтву патрэбную для агарожы суму.

Матар'ял на загарадзі выдаецца лясьніцтвам бясплатна па лесасечным білетах. Зьнішчаць загарадзі забараняецца.

8. За шкоду лясам ад пасьбы жывёлы адказваюць уласьнікі жывёлы.

9. На асоб, якія пасуць жывёлу без заключэньня дагавору з лясьніцтвам, бяз білету, у забароненых мясцох альбо зрабілі ў лесе патраву, накладаецца ў адміністрацыйным парадку штраф па ўстаноўленых таксах.

10. Калі ў лясох зроблена шкода паасобнымі грамадзянамі на суму да трох рублёў, то лясная адміністрацыя і варта маюць права спаганяць з вінаватых гэтую суму ў адміністрацыйным парадку. Разьмер шкоды вызначаецца паводле ўстаноўленых такс.

Пастановы, выданыя ў парадку гэтага артыкулу, могуць быць абскарджаны на працягу трох дзён у сельскі савет, рашэньне якога зьяўляецца канчатковым.

Старшыня СНК БССР **М. Галадзед.**
Кіраўнік Спраў СНК і Эканамічнай Нарады БССР. **М. Мароз.**
г. Менск. 23 красавіка 1928 г.

Постановление СНК БССР

об охране лесов.

Совет Народных Комиссаров БССР **постановляет:**

1. Запретить в государственных лесах без соответствующего письменного разрешения:

а) вырубать лес вообще и в частности не в том месте, которое указано в лесосечном билете;

б) вывозить из леса бурелом и валежник;

в) сдирать бересту, лык, луб и дубильную кору;

г) гнать смолу, деготь, обжигать уголь;

д) проводить дороги, использовывать лесную площадь для складов;

е) ставить ульи, косить траву и т. д.

Примечание 1. Для собирания в государственных лесах грибов, ягод, мха, листьев, лесной подстилки, а также древесного семени для лесокультурной работы письменного разрешения лесничего не требуется.

Примечание 2. Лесничие могут разрешать собирать в государственных лесах хворост и сучья.

2. Запретить в государственных лесах:

а) ломать деревья и портить их надсечками, падсечками и. т. п.

б) уничтожать, портить и переносить знаки, которые определяют границы кварталов, лесосек и др.;

в) разводить огонь в период с 1 мая до 1 октября.

3. Если древесина, полученная из лесов государственного или местного значения с целью использования для своих нужд в натуре, будет продана без разрешения, то с виновного взыскивается судом разница между той суммой, которую он заплатил за лес, и таксовой стоимостью с торговой наддачей.

Если же древесина задержана до продажи, то она изымается и поступает в распоряжение соответствующего земельного органа.

Если же суд установит, что, получая древесину як-бы для своих нужд и нужд в натуре, виновный имел в виду продать ее, то виновный кроме того привлекается к ответственности по ст. 187 Уголовного Кодекса.

Лицо, которое покупает древесины зная, что она получена продавцом с целью использования для своих нужд в натуре, привлекается к ответственности по ст. 139 Уголовного Колекса при чем купленная древесина от него изымается и поступает в распоряжение соответствующего земельного органа.

Примечание: Древесина незаконно добытая во всех случаях изымается и поступает в доход государства, а виновный привлекается к ответственности по ст. 99 Уголовного Кодекса.

4. Продажа древесины допускается, если в документе, на основании которого она приобретена, указано, что древесина куплена с торгов на общих основаниях с разрешением на продажу или предназначена для механической или химической переработки кустарно-промысловой кооперацией или отдельными кустарями.

5. Пастьба скота в государственных лесах допускается согласно договору местного населения с лесничеством на основании специального билета.

6. Запрещается пасти скот:

а) на площадях лесных рассадников и плантаций;

б) на делянках, на которых засеян или посажен лес;

в) на лесосеках, полянках и прогалинах, предназначенных для естественного лесовозобновления;

г) на выжженых местах;

д) в молодняках;

е) на участках, отведенных для постепенных семянолесосечных рубок;

ж) в заповедниках и в лесах, являющихся памятниками природы;

з) на площадях задернелых или полузадернелых песков.

7. Если указанные в ст. 6 площади находятся среди пастбищных мест или граничат с ними, то лесничество заключает договор на пастьбу только после того, как собственники скота согласно указаний и под наблюдением лесной администрации и стражи огородят эти площади или уплатят лесничеству необходимую для огорожения сумму.

Материал для изгороди выдается лесничеством бесплатно по лесосечным билетам. Разрушать изгороди запрещается.

8. За вред, причиненный лесу от пастьбы скота, отвечают собственники скота.

9. На лиц, которые пасут скот без заключения договора с лесничеством, без билета, в запрещенных местах или произвели в лесу потраву, накладывается в административном порядке штраф по установленным таксам.

10. Если в лесах произведено повреждение отдельными гражданами на сумму до трех рублей, то лесная администрация и стража имеют право взыскивать с виновных эту сумму в административном порядке. Размер вреда определяется по установленным таксам.

Постановления, вынесенные в порядке настоящей статьи, могут быть обжалованы в трехдневный срок в сельский совет, решение которого является окончательным.

Председатель СНК БССР **Н. Голодед.**
Управляющий Делами СНК и Экоком. Совещания БССР **М. Мороз.**
г. Минск, 23-го апреля 1928 г.

ХРОНІКА.

АД'ЕЗД УКРАІНСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ.

21 мая выехала дамоў дэлегацыя украінскіх пісьменьнікаў. У апошнія дні украінцы знаёміліся з рознымі культурнымі інстытуцыямі г. Менску і з працай балотнай станцыі.

Сялянскія экскурсіі ў Менск.

Менскі акруговы Інспактарыят Народнай Асьветы, каб даць магчымасьць сялянам азнаёміцца з горадам і буйнай прамысловасьцю—заводамі, фабрыкамі, умовамі працы рабочага, з сельска-гаспадарчымі дасьледчымі станцыямі, музэямі, кіно і іншымі культурна-асьветнымі ўстановамі,—у працягу чэрвеня і ліпеня арганізуе сялянскія экскурсіі ў гор. Менск.

Усяго мяркуецца правесьці 17 экскурсій (па аднэй з райёну Менскай акругі)

Экскурсанты ў горадзе будуць карыстацца дармовым памяшканьнем і абедамі.

На час экскурсій групы будуць забясьпечаны спэцыяльнымі экскурсійнымі кіраўнікамі.

У зьвязку з гэтым перад мясцовымі палітасьветчыкамі і аграномамі паўстае вельмі важная задача—дапамагчы на месцы раённаму інспэктару народнай асьветы своечасова падрыхтаваць экскурсіі.

Экскурсіі павінны кампляктавацца з дарослых сялян і сялянак-гаспадароў, у першую чаргу з беднякоў і серадвякоў, прычым трэба імкнуцца да таго, каб у склад экскурсій увайшлі прадстаўнікі ад некалькіх вёсак райёну (па 2-3 чалавекі).

Разам з гэтым вакол пытаньня правядзеньня экскурсій трэба згуртаваць грамадзкую думку, прыцягнуўшы да ўдзелу ў гэтай справе мясцовыя ўстановы (райзем аддзел, каапэрацыя, кам. узаемадапамогі).

Значная частка экскурсантаў—беднякі, ім неабходна дапамагчы сродкамі на праезд,—вось памянёныя ўстановы і павінны адшукаць на гэтую справу сродкі.

Экскурсіі сялян у горад у значнай меры дапамогуць падвышэньню культурнага і палітычнага ўзроўню вёскі, палепшаньню гаспадаркі і яшчэ большаму ўзмацненьню сувязі гораду з вёскай.

М. С.

Удзел БССР у Ніжагародзкім кірмашы.

Па прыкладу мінулых гадоў Белпайгандаль сёлета таксама будзе ўдзельнічаць ад прамысловасьці БССР у Ніжагародзкім кірмашы. Асабліва шырока Белпайгандаль мяркуе разгарнуць свае апэрацыі на кірмашы па рэалізацыі абутку, гатовага адзеньня і шпалераў.

У хуткім часе пачнецца канчатковае выяўленьне таварных фондаў, якія Белпайгандаль мае вывезьці на кірмаш. Звароты Белпайгандлю на кірмашы сёлета маюць дасягнуць 800000 рублёў.

На кірмашы мае таксама выступіць беларускі саматужна-прамысловы саюз, які даставіць розную мэблю, панчошна-трыкатажныя вырабы, абутак, гатовае адзеньне, скураную галянтарэю і пяньковыя вырабы. Усяго беларускі саматужна-прамысловы саюз мяркуе рэалізаваць сваёй прадукцыі на суму да 400000 руб. На кірмашы саюз мае закупіць мануфактуры, мэталётавары, скураных тавараў і інш.

2052620 руб. на разьвіцьцё грамадзкага харчаваньня.

Згодна 5-гадовага пляну Белкаапсаюзу, мяркуецца пабудаваць 2 сталоўкі ў Віцебску з прапуснай здольнасьцю ў 5000 абедаў штодзень. У Менску будзе пабудавана фабрыка-кухня на 10000 абедаў, у Гомелі—сталоўка на 3000 абедаў і ў Рэчыцы—на 1000 абедаў. На ўсё гэта мяркуецца адпусьціць у працягу 5 год 2052620 р.

Дэманстрацыя школьнікаў.

19 і 20 мая ў Менску былі арганізаваны факельныя працэсіі і дэманстрацыі камсамольскай школьнай моладзі г. Менску, прысьвечаныя міжнароднаму тыдню моладзі. Асабліва грандыёзна была дэманстрацыя моладзі ў нядзелю, 20 мая, калі на вуліцах Менску маршыравалі тысячы арганізаванай школьнай моладзі.

Менская страхкаса робіць справаздачу.

Гэтымі днямі закончыла сваю працу Менская акруговая канфэрэнцыя страхавой касы. На канфэрэнцыі былі заслуханы: справаздача страхкасы, даклад рэвізійнай камісіі і інш

За мінулы 1926-27 год страхкаса правяла значную працу. Для лепшага абслугоўваньня застрахаваных былі адчынены два выплатныя пункты на Пярэсьпе і Камароўцы. Уведзена новая форма бальнічных лісткоў, якая палягчае застрахаванаму атрыманьне дапамогі па хворасьці.

Паступленьне страхавых узносаў давядзена да 98,8 проц., цалкам зьліквідавана старая завінавачанасьць. Павялічаны нормы дапамогі па беспрацоўі на 17,7 проц., нормы пэнсіі па інваліднасьці—на 18,7 пр. Колькасьць застрахаваных з 31915 у 1925-26 годзе ўзрасла да 39946 у 1926-27 годзе, што дае павялічэньне на 25,2 пр. Такое павялічэньне застрахаваных тлумачыцца далучэньнем да Менскай акругі 6 новых райёнаў, пашырэньнем прамысловасьці, а таксама больш поўным абхопам страхаваньнем рабочых.

Страхавыя ўзносы за мінулы год складаюць 3.323.347, што дае павялічэньне, у параўнаньні з 1925-26 годам, на 24,2 пр. Такое павялічэньне паступленьняў страхавых узносаў тлумачыцца тым, што страхкасай былі прыняты самыя рашучыя меры да ліквідацыі старой завінавачанасьці і да спаганяньня бягучых страхавых узносаў.

Па фонду пэнсій і дапамог у 1926-27 г. мы маем прыбыткаў 2.056.228 руб., выдаткі—2.223.944 руб. Такім чынам, выдадзена грошай па фонду пэнсій і дапамог больш, чым паступіла, на 8,2 проц. Агульны дэфіцыт на 1-га кастрычніка 1927 г. складаў 242.032 руб.

Значныя сродкі выплачаны на кармленьне дзяцей. У працягу 1926-27 году было выплачана на кармленьне дзяцей 156081р., што, у параўнаньні з 1925-26 годам, дае павялічэньне на 6,8 проц.

За справаздачны год павялічыўся таксама лік пэнсіянэраў (на 34,6 проц.). На выплату пэнсій за мінулы год пайшло 408.965 руб.

Вялікую працу выконвае страхкаса па забесьпячэньні беспрацоўных. У 1925-26 годзе з Менскай страхкасы атрымлівалі дапамогу 2577 беспрацоўных, а ў 1926-27—3098. Выплачана беспрацоўным за апошні год 504.585 руб. Акрамя выдач грашовай дапамогі, беспрацоўным страхкаса выдала 45 тысяч руб. на арганізацыю працоўных калектываў, 7 тысяч руб. на грамадзкія работы і 5895 руб. на ўтрыманьне начлежнага дому, сталоўкі і інш.

Таксама павялічыўся лік застрахаваных, накіраваных у дамы адпачынку і на курорт. У дамы адпачынку было накіравана 4066 чал. (павялічэньне на 71,6 проц.), на курорты 150 чал. (павялічэньне на 38,9 проц.).

* * *

У спрэчках па дакладу страхкасы выступіла шмат таварышоў.

Тав. **Гарлавіцкі** лічыць, што страхкаса мала зварачвае ўвагу на спаганяньне страхавых узносаў. Есьць шмат арганізацый і ўстаноў, якім удаецца ўхіліцца ад узносаў. Страхкаса ня прымае захадаў да таго, каб будаўнічыя работы пачыналіся раней, тады ня трэба было-б плаціць дапамогу па беспрацоўі. Напрыклад, зараз на Біржы Працы знаходзіцца каля 2500 чал. беспрацоўных муляроў. А чаму-б не распачаць будаўнічыя работы на 3-4 тыдні раней?

Тав. **Крэйнбэрг** скардзіцца на тое, што страхкаса мала зварачвае ўвагі на выплату дапамогі тым катэгорыям беспрацоўных, якія жывуць у райёне. Іх анкеты разглядаюцца па 5-6 месяцаў, урэшце, гэтыя беспрацоўныя атрымліваюць значна менш таго, што ім належыць.

На думку тав. **Мяркулава**, органы сацыяльнага страхаваньня павінны больш чула адносіцца да наведвальнікаў. Трэба ўзяць пад увагу, што наведвальнікі страхкасы ў большасьці хваравітыя, нэрвовыя людзі; трэба ўжыць меры да таго, каб зьнішчыць чаргі ў страхкасе.

На активе Менскай арганізацыі ЛКСМБ.

19 мая ў клюбе К. Маркса адбыўся сход актыву Менскай арганізацыі ЛКСМБ. На сходзе прысутнічала звыш 500 камсамольцаў.

На гэтым сходзе сэкратар ЦК ЛКСМБ тав. **Галавач** зрабіў даклад аб выніках працы ўсесаюзнага і ўсебеларускага зьезду камсамолу. У сваім дакладзе т. Галавач падагуліў вынікі апошніх камсамольскіх зьездаў і коратка застанавіўся на чарговых задачах ленінскага камсамолу.

У спрэчках выступала 7 чалавек, у тым ліку т. т. **Кнорын і Славінскі.** Тав. Кнорын у сваёй прамове спыніўся, галоўным чынам, на асобных момантах культурнай рэвалюцыі, а тав. Славінскі зьвярнуў увагу камсамолу на інтэрнацыянальнае выхаваньне.

Сход актыву аднагалосна прыняў рэзалюцыю аб ажыцьцяўленьні ўсіх пастаноў апошніх зьездаў камсамолу.

Дасягненьні Менскага Вячэрняга Рабочага Унівэрсытэту.

19 мая ў актавай залі Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту адбыўся ўрачысты сход слухачоў Менскага Вячэрняга Рабочага Унівэрсытэту, прысьвечаны сканчэньню першага вучэбнага году. З прывітаньнямі выступілі: Намесьнік Нар. Кам. Асьветы тав. Валасэвіч, рэктар БДУ праф. Пічэта, загадчык вучэбнай часьці Вячэрняга Унівэрсытэту тав. Ошараў і інш. Прамоўцы адзначылі вялікае значэньне, якое мае Рабочы Унівэрсытэт у падвышэньні ведаў рабочымі і ў справе падрыхтоўкі савецкіх спэцыялістаў.

Зараз у Менскім Вячэрнім Рабочым Унівэрсытэце навучаецца 100 рабочых, занятых непасрэдна на вытворчасьці. Пасьпяховасьць студэнтаў была здавальняючая.

З будучага навучальнага году ў Унівэрсытэце будзе арганізавана 2 аддзяленьні: адно з грамадзка-эканамічным ухілам і другое з тэхнічным ухілам.

Студэнцкія экскурсіі.

ЦБ пралетстуду разьмеркавала паміж навучальнымі ўстановамі БССР месцы на экскурсіі ў часе летніх вакацый.

Усяго мае быць накіравана ў экскурсіі звыш 700 студэнтаў. Экскурсіі адбудуцца на Каўказ, у Крым, у Туркестан, на Мурманск, у Маскву і Ленінград.

У большасьці ў экскурсіі будуць накіраваны такія студэнты, якія ніколі не выяжджалі за межы БССР.

Студэнты Аршанскага і Чырвона-Бярэскага Белпэдтэхнікумаў наладзяць экскурсіі ў Менск.

Савецкі дзень.

Усебеларуская нарада працаўнікоў пэдтэхнікумаў склікаецца на 15 чэрвеня. Нарада, паміж іншымі пытаньнямі, абгаворыць сыстэму пэдагагічнай практыкі ў пэдтэхнікумах.

58 чалавек накіроўвае Наркамздраў для працы ў палявых яслях. Едуць на працу мэдычныя сёстры і студэнткі мэдфаку. Сваю працу дзіцячыя яслі разгорнуць у першай палове чэрвеня.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК.

(НА 22 МАЯ 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз.—прад. 4—68,5, куп. 4—66,5.
Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—03,5, куп. 5—01,5.
Абл. 2 сял. паз.—куп. 5.
Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—06, куп. 5—04.
Абл. 10 пр. дзярж паз. г.—прад. 25—35, куп. 25—25.
Абл. дзярж. паз. 1926 г.—прад. 121—25, куп. 119—25.
Абл. 12-проц. дзярж паз.—прад. 105—74, куп. 105—69.
Абл. 6-проц. паз. індустр.—прад. 24—74,5, куп. 24—64,5.

СХОД ПАРТАКТЫВУ.

У чацьвер, 24 мая, а 6 з пал. гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу імя Карла Маркса склікаецца сход гарадзкога партактыву па пытаньні аб рашэньнях апошніх пленумаў ЦК і АК КП(б)Б. Дакладчык тав. Славінскі.

Члены і кандыдаты ЦК, ЦКК, АК, АКК КПБ уваходзяць па сваіх пасьведчаньнях, астатнія па білетах, якія атрымоўваюцца у Райкомах КПБ.

МЕНСКІ АК КП(б)Б.

СУД.

З-ЗА ЧАРКІ—У НЯВОЛЮ.

Сяляне вёскі Запішша, Шклоўскага раёну, Віктар і Адам Цымбарэвічы у хаўрусе з Рэянтовічам Станіславам надумалі перад вялікаднем нагнаць самагону. Надумана—зроблена: гатовую брагу павезьлі ў лес, дзе ўжо быў падрыхтован і апарат. Але сябра сельсавету Станкевіч Мацей, якому даручан быў нагляд за такімі процізаконнымі справамі, з панятымі папрабавалі затрымаць самагоншчыкаў, як толькі тыя ад'ехалі ад гумна. Але ня тут-та было: два Цымбарэвічы і Рэянтовіч кінуліся ў бойку, разагналі панятых, а Станкевіча спляжылі кіем па галаве і руках. Пачуўшы крык, на дапамогу самагоншчыкам прыбег і трэці Цымбарэвіч. Дзякуючы гэтаму, самагоншчыкі здолелі ўцячы.

Магілеўскі Акруговы Суд прыгаварыў трох вышэйпамянёных хаўрусьнікаў і чацьвертага дапамагача на тры гады пазбаўленьня волі кожнага з суровым адмежаваньнем; па дапасаваньні да асуджаным Кастрычнікавай амністыі—Віктару і Адаму Ф. Цымбарэвічам і Станіславу Рэянтовічу кара была зьніжана да 1 году 6-ці месяцаў, а чацьвёртаму Цымбарэвічу, як няпоўналетняму,—да 1 году.

Вярхоўны Суд прыгавар па гэтай справе пакінуў у моцы, а касацыйную скаргу—бяз вынікаў. У парадку артыкулу 420 КПК меру сацыяльнай абароны асуджаным Цымбарэвічам Віктару і Адаму Ф. і Рэянтовічу скараціў да двух гадоў пазбаўленьня волі, а Цымбарэвічу Адаму Вінцэсеву—да 1 году і на падставе амністыі ЦВК СССР ад 2-XI 27 г.—першым тром асуджаны меру сацыяльнай абароны скараціў напалавіну, а Цымбарэвіча Адама Вінцэсявага—ад пакараньня вызваліў.

Шуляк.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Вынік п'янства.

Грамадз. вёскі Асава, Бярэзінскага райёну Міхалай Маркевіч і Міхась Рабковіч 26 лістапада 1927 г. варочаліся дамоў з вёскі Пілсты пасьля пабудовы мосту. Па дарозе яны выпілі 2 бутэлькі гарэлкі і распачалі сварку, у часе якой Маркевіч кінуў сякерай у Міхася Рабковіча, прычым забіў яго на сьмерць. Выяздная сэсія Менскага акруговага суду прыгаварыла Міхалая Маркевіча на пяць гадоў зьняволеньня з суровым адмежаваньнем.

Даляры падвялі.

Грамадз. м. Красналукі, Халапеніцкага райёну, Іцка Гурэвіч 26 сакавіка 1926 г. быў затрыман каля польскай мяжы. У часе вобыску ў Гурэвіча была знойдзена дошка, у якой было схована 390 амэрыканскіх даляраў і пісулька на яўрэйскай мове, напісаная Гурэвічам знаёмаму Залмаву ў Польшчу з просьбай прысланць кантрабанду. Суд прыгаварыў Гурэвіча на год зьняволеньня, але на аснове амністыі ад трыманьня пад вартай вызваліў. Даляры канфіскаваны ў даход дзяржавы.

БІБЛІАГРАФІЯ.

Часопіс „Паляўнічы Беларусі“ № 2, выданьне Беларускага Прамыслова-Каапэрацыйнага Саюзу паляўнічых. Менск, красавік, 1928 г. Цана 30 кап. Тыраж 13000.

Так і пачнём з першага артыкулу „За што судзяць Беларускую Сялянска-Работніцкую Грамаду“—Юр. М-і.

У гэтым артыкуле аўтар прыводзіць некаторыя лічбы разьмеркаваньня зямельнага фонду паміж абшарнікамі, кулакамі, беднякамі і серадняками. Ён даводзіць, што 3100 абшарнікаў уладаюць 2567400 гэктарамі зямлі, а на долю 258700 бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак выпадае толькі 1173200 гэкт.

Параўнаўшы гэтыя лічбы з лічбамі тав. Традыцыя, якія ён прыводзіць у артыкуле «Па сьлядох Раманавых» („Бальшавік Беларусі“ № 2, люты 1928 г., стар. 6-23), мы бачым значную розьніцу: там на стар. 7 напісана: 3745 буйным гаспадаркам належыць 1874386 гэкт. (заміж 3100 гаспад. і 2567400 гэкт.) і 383796 бядняцкім і серадняцкім гаспадаркам належыць 2293857 гэкт. (заміж 258700 гаспад. і 1173200 гэкт.)

Як відаць, няўвязка досыць значная.

Большасьць астатніх артыкулаў маюць цікавасьць для паляўнічага.

Вось толькі адна хранікёрская заметка, памойму, недарэчная. Там, на 29 старонцы напісана, што маецца гадавальнік кроўных сабак, а дзе ён знаходзіцца, якія там пароды маюцца, якія ўмовы карыстаньня матар'ялам гадавальніка—гэтага ня відаць.

Затым пры 13 тысячным тыражы і пры выданьні часопісу раз у два м-цы, трэба і нават неабходна зрабіць яго больш каштоўным як па зьместу, так і па разьмеры. Бо 36 старонак у два месяцы ні аднаго чытача задаволіць ня могуць, асабліва калі мець на ўвазе мэтад яго распаўсюджваньня. Калі мы мянялі зімою паляўнічыя білеты, нам «далікатна» прапанавалі ўнесьці грошы за год наперад і на часопіс «Паляўнічы Беларусі». А калі не «падпішашся»—не атрымаеш білета.

Такая, бачыце, пастанова ўсебеларускага зьезду.

Прыходзіцца згадзіцца. Але адначасова, здаецца, зьезд ня меў на ўвазе, што цэнтр. праўленьне будзе выдаваць такі невялічкі часопіс.

Далей адносна мовы.

На 36 старонак тэксту толькі 10 старонак тэксту беларускага. Чым гэта тлумачыцца—ня ведаю.

З боку тэхнікі і якасьці паперы часопіс мае выгляд здавальняючы.

Думаю да мяне далучацца ўсе паляўнічыя Беларусі, калі я выкажу пажаданьне аб палепшаньні нашага часопісу ў бок павялічэньня яго разьмеру, а таксама зьмяшчэньня жыцьцёвага, практычнага матар'ялу.

Паляўнічы.

АПАВЯШЧЭНЬНІ.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня, 22-га мая, адбудзецца адчынены сход ячэйкі КПБ працасьветы. На абвестцы дню—даклад аб становішчы 30-й яўрэйскай школы.

Пачатак а 7-й гадзіне ўвечары. Запрашаюцца ўсе асьветнікі.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА**

Папраўка.

У № 114 (2302) нашай газэты за 19 мая г. г. у „Абавязковай пастанове № 26 Менскага Гарадзкога Савету“ укралася памылка. Надрукавана:

«Увага: На Ляхаўцы ад рогу Кажэўнай да заводу «Энэргія» тратуары павінны быць шырынёй ня менш 1,5 САНТ., а павінна быць—„ ... НЯ МЕНШ 1,5 МЭТРАЎ“.

Папраўка.

У № 115 (2303) нашай газэты за 20 мая г. г.—у «Заключительном балансе Витебской Государственной Очковой фабрики им. Розы Люксенбург» укралася памылка. Надрукавана: «На 1-е октября 1928 года», а павінна быць: «На 1-е октября 1927 года».

СПРАВАЗДАЧА ВЕЧАРА КАМІТЭТУ АБАРОНЫ ГРАМАДЫ,

які адбыўся 19 красавіка 1928 г.

ПРЫБЫТАК.		ВЫДАТКІ.	
1. Атрымана ад камітэту на арганіз. выдаткі	25—	1. Тавары ў буфэт	55—21
2. Атрымана запазычан. ад паказу БДТ	18—	2. Частаваньне артыстых	19—40
3. Прададзена білетаў у клюб Карла Маркса	904—75	3. Рояль	27—
4. Лётарэя	238—24	4. Тэхнічн. працаўнікі, кантроль	14—
5. Вудачка	60—11	5. Аркестр	40—
6. Пошта	5—25	6. Ахова вешалкі	12—
7. Кветкі	19—55	7. Заля	50—
8. Праграмы	74—65	8. Друкаваньне афіш	10—
9. Вешалка	40—50	9. Расклейка афіш	11—25
		10. Возьнікі	4—
		11. Кніжкі кантр.	—67
		12. Папера	1—06
		13. Тэх працаўн. у буфэце	11—50
		14. Возьнік	2—25
		15. Дастаўка касьцюмаў	2—
РАЗАМ	1386—05	РАЗАМ	260—30

ЧЫСТЫ ПРЫБЫТАК . . . . . 1125—75

Старшыня Камітэту Абароны Грамады **ЯНКА КУПАЛА.**
Старшыня Гаспадарчай Камісіі **П. ТРАМПОВІЧ.**
Скарбнік Камітэту **А. СЯНКЕВІЧ.**

Праўленьне Гомельскага Рабочага Банку

даводзіць да ведама АКЦЫЯНЭРАЎ, што 26-га мая г. г. а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Банку (Савецкая, 48) адбудзецца АГУЛЬНЫ СХОД АКЦЫЯНЭРАЎ БАНКУ

Разгляду і абмеркаваньню сходу падлягаюць наступныя пытаньні:

1. Справаздача Праўленьня аб дзейнасьці банку за 1926-27 апэрацыйны год і заключэньне рэвізійнай камісіі.
2. Разьмеркаваньне прыбыткаў.
3. Пытаньне статутнага характару.
4. Выбары органаў кіраўніцтва.
5. Бягучыя справы.

У выпадку, калі на гэты сход ня зьявіцца колькасьць акцыянэраў, якая прадугледжана § 79 статуту, **ДРУГІ СХОД** які будзе лічыцца законна адбыўшымся, незалежна ад ліку акцый, якія будуць прад'яўляцца прышоўшымі на сход акцыянэрамі, назначаецца на 27 мая а 7 гадзіне ўвечары.

Праўленьне.

Барысаўскі Гарадзкі ЗАГС выклікае **гр. Палякова Дзям'яна Мікалаевага** на 9 чэрвеня г-г. па справе скасаваньня шлюбу згодна заявы **гр. Паляковай Марфы Якімавай,** жых. Барысаў, Савецкая вул. д. № 84.

Гомельскі Акр. ЗАГС паведамляе, што **ГАЎРЫЛАЎ Хведар Анісімавіч** яго жонка **Хрыстына Сіманава,** якія находзяць з грам. Чэчэрскага райёну, выселку «Рэв. Путь» і пражываюць там-жа зьмяняюць прозьвішча **«ГАЎРЫЛАЎ»** на прозьвішча **«ЧЫКІД».**

НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ ГАНДЛЮ БССР

ПАДАЕ ДА АГУЛЬНАГА ВЕДАМА.

што 7 мая 1928 году ім унесены, у адпаведнасьці з палажэньнем аб дзяржаўных прамысловых трэстах, абвешчаным у С. З. СССР за 1927 год № 39, арт 392, у другі падзел гандлёвага рэесту СССР (па БССР) пад № 8

НАСТУПНЫЯ ЗЬМЕНЫ СТАТУТУ

Віцебскай Дзяржаўнай Панчошна-Трыкатажнай фабрыкі:

Мэта—выраб і збыт панчох і іншых трыкатажных і галянтарэйных тавараў.

Новы статут зацьверджан пастановай Прэзыдыуму ВСНГ БССР ад 29 лютага 1928 г. за № 24. Статутны капітал вызначан у 276000 руб.

Сэкратар НК Гандлю БССР **ВЕРАМЕЙЧЫК.**

ПАМЯШКАНЬНЕ ЦЫРКУ. Сёньня і штодня ад 10-й г. раніцы да 11-й г. веч. адкрыта **ЗООВЫСТАЎКА ЖЫВЫХ ЗЬВЯРОЎ.** Кармленьне зьвяроў а 8-й гадз. вечара.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». Толькі тры дні будзе дэманстравацца баявік **„ТРЫПОЛЬСКАЯ ТРАГЭДЫЯ“**

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“. З 22 мая—прыключэнская пастаноўка **„НАЧНЫ ЭКСПРЭС“.** **У гал. ролі Гары Піль.** Штодня 3 сэансы. Пачатак 1-га сэансу ў 7 гадзін.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З 22 мая—працяг 2-й і заключная 3-я сэрыя **„ПЛЯМА ЗЛАЧЫНСТВА“** у 12-ці частках

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». Новы бытавы фільм **„ГАНЧАРЫ“** («Шчасьлівыя чарапкі») у 6-х частках. Пачатак сэансаў у 7 гадз. 45 хв.

ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ БУХГАЛТЕРИИ, КАЛЬКУЛЯЦИИ И СТАТИСТИКИ
ПРИ Ц. К. С. Б.
— Продолжительность курса—8 МЕСЯЦЕВ. —
— Поступать на курсы можно в любой месяц года. —
Принимаются лица с образованием не ниже 4 гр. семилетки.
ОКОНЧИВШИМ КУРСЫ ВЫДАЮТСЯ СВИДЕТЕЛЬСТВА.
Плата за первый месяц—5 руб., а за остальные по 4 руб. в месяц ВНОСИТСЯ В НАЧАЛЕ КАЖДОГО МЕСЯЦА ВПЕРЕД по адресу: МИНСК, ВСЕКОБАНК, тек. счет № 682.
Подробные условия высылаются за 2 восьмикопеечные марки. С запросами обращаться: Минск, Всекобанк, заочным курсам.

Галоўлітбел 302.

1-я Дзяржаўная друкарня.